

*« У меня было впечатление, что я получил письмо из Атлантиды. Мне казалось, что наша маленькая Родина, детство, давно уже затонула и остались только смутные легенды...»*

*(з ліста Ф. Станевіча)*

# *Гаспадыня самотнага хутара*




Глушыцы... Чатыры маляўнічыя, прыгожыя і так дарагія сэрцу невялічкія хутары ў Спондаўскім сельсавеце, якія знаходзяцца адзін ад аднаго ў радыусе 0,5 км.

Калі з бібліятэкі, дзе я працую, і якая размешчана на другім паверсе адміністрацыйнага будынку, выглянуць у акно, што выходзіць на паўночны захад, то адразу заўважаеш зялёны “астравок”, які плавае сярод прастораў збажыны – зялёны ўвесну, жоўты ад спелага калосся летам, пакрыты белым покрывам снягоў узімку. Гэта Глушыца 1.

Крыху лявей віднеецца віхрасты чубок сасонніку і верхавіны цэлага раду векавых дубоў, якія пасадзіў мой дзядуля Клеманс Валуевіч. Раслі гэтыя дубы разам з яго сынамі, бачылі як жылі, смуткавалі, пераадольвалі цяжкасці, святкавалі і весяліліся, працавалі на сваёй зямельцы людзі. Дубы засланялі сабой будынкі ад шалёных вятроў, прымалі на сябе ўдары маланак. Яны праводзілі ў апошні шлях гаспадароў засценку і, падобна, што ў хуткім часе яны застануцца адзінымі ўладарамі і гаспадарамі гэтага хутара. Гэта Глушыца II.

Яшчэ лявей бачна шапка кучаравага клёну і страха нейкай пабудовы. Гэта Глушыца III. Толькі IV Глушыцу цяжка заўважыць – яна схавалася ў лесе прыкладна за паўкіламетра ад астатніх.

Пішу гэтыя радкі і сэрца баліць, захлынаецца ад жалю. Яшчэ нядаўна тут кіпела жыццё, звінелі дзіцячыя галасы, буялі кветкамі

**палісаднікі... А зараз толькі падмуркавыя камяні, здзічэлыя яблынькі і кусты бэзу ды язьміну нагадваюць аб тым, што некалі тут было чалавечае жыллё.**

**Першай апусцела І-я Глушыца ў 90-х гадах мінулага стагоддзя, затым IV, пасля III.**

**Калі задумацца аб паходжанні назвы, то адразу прыходзіць на думку, што яна паходзіць ад слова "глуш". Але, магчыма і другое паходжанне. Успамінаецца выпадак, калі я ехала на поўдзень Польшы ў невялікі шахцёрскі гарадок. Баючыся праспаць сваю станцыю, падхоплівалася на кожным прыпынку. І вось, цягнік спыніўся, выглядваю ў акно і чытаю назву вакзала: *Gluszyca Gluwna*. Аказалася, што гэта вялікі горад на поўдні Польшы. Можа быць і так, што нашы хутары названы ў гонар гэтага горада.**

**Апроч афіцыйных Глушыцы маюць і, так бы мовіць, "народныя" назвы. Так, Глушыцу IV называлі Шурпіцкія, таму што амаль усе яе жыхары мелі такое прозвішча. III Глушыца – Бахцюкі, там некалі жыў чалавек, у якога мянушка была Бахцюк. II Глушыца – Валуі (назва не была папулярнай), таксама таму, што яе жыхары ўсе мелі прозвішча Валуевіч. І Глушыца – Шульгачы. Прычым, нават у касцёльнай кнізе 1909-1913 гадоў так і запісана "Глушица (Шульгачи)". Даведацца з афіцыйных крыніц паходжанне гэтай назвы не атрымалася. Геня Семашкевіч расказала, што ў дзяцінстве дзед Казімір расказваў ім, дзецям, пра пана Шульгу, які быў уладальнікам гэтага хутара. Рычард Памецька ад сваіх дзядоў чуў, што тут працаваў невялікі спіртзавод, і што сажалка, якая знаходзіцца ў цэнтры хутара, служыла ў якасці кандэнсатара. Дно ў ёй выкладзена ці то цэглай, ці то глінай з саломай, але было цвёрдым і вада заўсёды чыстай і халоднай. Крынічнымі хадамі гэта сажалка злучалася з нашай II Глушыцай. Больш яркая і багатая прырода ў Шульгачах: тапалёвая палісада, ліпы, ляшчыны і больш рэдкая парода дрэў - вяз і граб, які, як напісана ў Энцыклапедыі Прыроды Беларусі, выкарыстоўваўся для азелянення паркаў і сквераў.**

**А насялялі Глушыцы простыя, шчырыя, добрыя і працавітыя людзі, якія потам і мазалямі зараблялі "хлеб свой надзённы". У II Глушыцы амаль усе былі людзьмі масцеравітымі. Мой бацька, Франц Валуевіч, быў адным з лепшых у акрузе печнікам і столерам. Заказваць вокны, веранды і шмат чаго іншага прыязджалі нават з Астраўца. Дзядзька, Антось Валуевіч, таксама патроху займаўся сталяркай і быў шорнікам. Сын Міхаіла Валуевіча Чэсь быў кавалём, меў сваю кузню ў сасонніку, які і зараз называецца Кузенькай. Таленавітымі былі і жанчыны. Уладыслава Валуевіч і Стэфанія Місюк былі вядомымі ў акрузе швачкамі, нават вучаніц мелі. Элеанора Валуевіч, мая мама, ткала дываны, настольнікі і ручнікі, якія пабывалі на розных выставах. Сама прыдумвала ўзоры і умела "наводзіць" кросны. Некаторыя з вырабаў Э.**

**Валуевіч і У. Валуевіч знаходзяцца ў Гродна ў музеі. Аб іх пісала В. Волах у газеце «Сельская жизнь» «Мастера с хутора Глушица» у 1987 годзе.**

**А гонар і слава нашай зямлі – гэта яе слаўныя сыны, пра якіх і пойдзе размова на старонках гэтага выдання.**

*«… И всё-таки жизнь идёт своей дорогой. Срубленный клён начал расти заново и его молодая поросль уже почти три метра высотой, хотя «Атлантида» и затонула окончательно, только отдельные щепки плавают на поверхности. И невылеченная боль в душе никогда не утихнет...»*

*(з ліста Ф. Станевіча)*



Глушыца – незвычайнае месца, месца, дзе выраслі цудоўныя і таленавітыя людзі. Напэўна, і бацькі, і сонейка, і травіца, і вадзіца, і расінкі, і былінкі дапамагалі таленту.

Л. С. Ромаш
г. Мінск.

## Глушыца IV



Выпіска з гаспадарчай кнігі Спондаўскага сельсавета, 1953 год. Калгас імя Сталіна:

1. **Шурпіцкі Пётр Міхайлавіч – гл. С., 1892г.**
2. **Шурпіцкая Геноэфа Аляксандраўна – жонка, 1898г.**
3. **Шурпіцкая Ванда Пятроўна – дач., 1942г.**
4. **Шурпіцкі Геральд Пятровіч – сын , 1946г.**

**1. Грынцэвіч Стафанія Адамаўна – гл.с., 1895г.**

**1.Шурпіцкая Гэлена Канстанцінаўна – гл. с., 1908г.**

**1. Ягела Вікенцій Францавіч – 1898г. У гаспадарчай кнізе 1953г. не пазначаны, таму што ў гэты час ён жыў у в. Страча**



## НАРОДНЫ ЎМЕЛЕЦ ЯГЕЛА

Спондаўская зямля славіцца не толькі прыгажосцю сваіх месц. Гэта зямля дала нам шмат таленавітых людзей – паэтаў, грамадскіх дзеячоў, народных умельцаў. Сярод апошніх слынныя майстры па дрэву: Буйчык Ян з Жэлядзі, Лаўрыновіч Кліменцій з Ёдабора, Пупінскі Юзэф з Толаяў, Міхновіч Іосіф са Спондаў. А найбольш праславіўся сваім майстэрствам, сваёй неардынарнай асобай і сваім гучным імем Вікенцій Францавіч Ягела, нашчадак славутай дынастыі Ягелонаў.

Нарадзіўся ён у 1898 годзе у засценку Глушыца. Дзяцінства не было бязвоблачным – калі яму споўнілася ўсяго два месяцы – памерла маці. Бацька выехаў у Пецярбург і ў хуткім часе стварыў новую сям'ю. Як часта апавядаецца ў казках, так здарылася і ў жыцці. Мачаха неўзлюбіла свайго пасынка і, нават, хацела зжыць яго са свету. Але так даў Бог, што яна сваімі намерамі падзялілася з сястрой, а тая, сэрдабольная жанчына дала хлопцу грошай на дарогу і параіла ўцякаць. Тым часам хлопчык адну зіму паспеў правучыцца ў прыватнага майстра-чырвонадрэўшчыка, што і налажыла свой адбітак на далейшы яго лёс.

Вярнуўся да дзядзькі ў Глушыцу. Пачаў хадзіць па дварах і майстраваць на заказ вокны, дзверы, затым будаваць хаты. Адна з самых прыгожых на той час хат у наваколлі – хата Субача Іосіфа ў вёсцы Трашчані пабудавана рукамі Ягелы. Сялянскі дом, зладжаны з бруса, адрозніваўся ад іншых высокай, стромкай страхой, крытай чарапіцай і вельмі прыгожым, з каляровымі шклямі, ганкам-верандай. Потым многія больш-менш заможныя гаспадары заказвалі майстрам падобныя веранды.

Падсабраўшы грошы Ягела пачаў будаваць уласны дом на засценку Кіркішкі, але здарылася няшчасце – няскончаны дом згарэў у 1939 годзе. У 1960-м разам з малодшым сынам Паўлам пабудаваў дом у Страчы, дзе і жыў да апошніх дзён.

Адначасова займаўся вырабам прадметаў дамашняга побыту з дрэва. Сам сабраў свой першы такарны станок, на якім і выточваў талеркі, лыжкі, апалонікі.

Пасля вайны цалкам прысвяціў сябе любімай справе. Удасканальваў станкі – сабраў нажны такарны станок. Як вядома, у той час купіць што-небудзь прыгожае не было дзе ды і за што, таму мясцовыя дзяўчаты ішлі за ўпрыгожваннямі да Ягелы. І ён выточваў для іх розныя грабяні, пацеркі і іншыя ўпрыгожванні.

З 1965 года Ягела пачаў працаваць для Мінскай галантарэйнай фабрыкі. Сабраў уласнаручна тры станкі з электрапрывадамі.
Формы для сваіх вырабаў ён пераймаў у прыроды, пераасэнсоўваючы іх на свой лад. Як мастак-іканапісец садзіўся пісаць ікону з чыстым сэрцам, падобна і Ягела, калі распрацоўваў новыя ідэі, закрываўся ў пакоі адзін і думаў, разважаў, чарціў…

Для фабрыкі Вікенцій Францавіч вырабляў даволі шырокі асартымент вырабаў. Гэта пацеркі, кулоны, грабяні, гузікі розных памераў. Гузікі большых памераў, так званыя пальтовыя, з акругленай паверхняй, не апрацаваныя па краях і, трошкі,няправільнай формы, стварылі ўражанне прыроднага кусочка драўніны. Гузікі меншых памераў рабіліся на металічнай ножцы для прышывання. А ўзятыя разам меншыя і крыху большыя гузікі ўтваралі арыгінальныя запінкі. Такімі ж арыгінальнымі былі і шкатулкі для захоўвання біжутэрыі, папяльнічкі, сальнічкі, алоўніцы, чарнільныя прыборы, вазы для кветак, шкатулкі у выглядзе грыбка, падсвечнікі.

Яго вырабы карысталіся шырокім попытам, работы экспанаваліся на шматлікіх выстаўках. За актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага фестывалю моладзі і студэнтаў у 1957 годзе ён быў узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР і Беларускага Рэспубліканскага Камітэта прафсаюза работнікаў культуры. Меў шэраг грамат, падарункаў і прэмій за вытворчыя поспехі.

За поспехі ў народнай гаспадарцы СССР у 1978 годзе Ягела Вікенцій Францавіч пастановай галоўнага Камітэта Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР узнагароджаны бронзавай медаллю.
Дрэва ў руках гэтага таленавітага чалавека спявала. Звычайную драўляную нарыхтоўку ён мог ператварыць у арыгінальны твор прыкладнога мастацтва. Добра ведаў уласцівасці драўніны. Напрыклад, для грэбеня ён браў клён, для пацерак – чачотку, для талерак, каб атрымаць прыгожы ўзор драўніны, браў ясень па тангенцыянальнаму зрэзу. Для астатніх вырабаў – карэльскую бярозу, якую яму завозілі леснікі з навакольных лясоў.

Як дарагую рэліквію, захоўваюць нашчадкі Ягелы рэчы, якія ён стварыў у адзінкавым экзэмпляры, так бы мовіць, для душы. Гэта ложак-люлька для першага сына, ружанец для жонкі, ваза напольная з накрыўкай вышынёй 50см., цукерніца з накрыўкай, рамкі для абразоў, шафэчка, накшталт сейфа з каваным вечкам для ключа, рытуальныя падсвечнікі, якімі і зараз карыстаецца ўсё наваколле ў сумных выпадках.
Вікенцій Францавіч быў шчодрым чалавекам. Шмат сваіх вырабаў ён падараваў установам – сельскаму Савету, калгасным канторам, пошце і проста добрым людзям.

Сваім талентам і вопытам  ён шчодра дзяліўся з моладдзю. Меў вучняў-паслядоўнікаў свайго майстэрства: Лукашэвіча Леаніда, Барана Вайцеха, Ліпніцкага Іосіфа, Лісавец Лілю, Шаўліса Станіслава, Вайцяховіча Віктара, Леаніда і Гражыну Лукашэвічаў. Самым здольным вучнем Ягелы стаў

Лаўрыновіч Кліменцій Іосіфавіч з засценку Едабор. Толькі ён працаваў у іншым напрамку – стаў чырвонадрэўшчыкам.

Майстар Клімка (так называлі яго ў народзе) пачынаў працаваць разам з Ягелам, дапамагаючы яму будаваць хаты, а калі падвучыўся, стаў працаваць самастойна. Майстраваў вокны, дзверы, колы, табурэткі, зэдлі, крэслы. А потым асвоіў камоды і шафы. Клімкавы шафы і зараз стаяць у многіх дамах: двухдзверныя, прыгожа афарбаваныя.

Традыцыі ў афарбоўцы мэблі ў Беларусі перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Клімка таксама карыстаўся традыцыйным спосабам афарбоўкі – фляндроўкай, хвалісты арнамент, узор бягучай вады. Яго мэбля вылучалася не толькі фуекцыянальнай сутнасцю, але і мастацкім выкананнем. Яго шафы мелі фрызавае завяршэнне. Унізе тры шуфляды, з каванымі вечкамі для ключа ў выглядзе грэбеньчыкаў, альбо кляновага ліста. Яго мэбля карысталася шырокім попытам сярод мясцовага насельніцтва, а шафы, кажуць, прыязджалі нават з Вільні заказваць.

Настаўнікам Ягела быў вельмі патрабавальным (ён і ў жыцці адрозніваўся надзвычайнай педантычнасцю ва ўсім). Калі працаваў у Страчскай сямігодцы настаўнікам працоўнага навучання, то ніколі не дазваляў вучням узяць у рукі тупы, ці няспраўны інструмент. Вучыў правільна карыстацца інструментамі, вастрыць гэблікі, стамескі, вастрыць і разводзіць пілы. Іншы раз прыносіў на урок што-небудзь са сваіх вырабаў, паказваючы, што з простага куска дрэва можна зрабіць прыгожую і карысную рэч.

Па ўспамінах людзей, якія добра яго ведалі, Ягела і ў жыцці быў неардынарнай асобай. Разнабакова эрудыраваны, цікавіўся палітычным жыццём, рэгулярна чытаў перыёдыку, вызначаўся глыбокім веданнем прыкладнога і выяўленчага мастацтва. Асабліва захапляўся творчасцю Пітэра Паўля Рубенса і гаварыць мог пра яго бясконца.

Чытаць і пісаць умеў на польскай, беларускай і рускай мовах. Чытаў многа і меў шматлікую асабістую бібліятэку. Любімы аўтар – Адам Міцкевіч. Захапляўся яго творчасцю і збіраў яго кнігі. Спецыяльна ездзіў у Мінск, хадзіў па букіністычных магазінах і сабраў амаль што ўсе выданні гэтага аўтара на польскай і рускай мовах.

Любіў усё прыгожае – мастацтва, кнігі, музыку. Любімы музычны твор – вядомы паланез Агінскага “Развітанне з Радзімай”. Сам нядрэнна граў на скрыпцы. Самастойна змайстраваў для сябе скрыпку і граў на ёй. У час вайны гучанне Ягелавай скрыпкі спадабалася нямецкаму салдату; прыйшлося зрабіць яшчэ адну. А тая, першая, перайшла да ўнучкі, якая скончыла музычнае вучылішча па класу скрыпкі.

Разам са сваёй вернай спадарожніцай жыцця Тэафіліяй Віктараўнай выгадавалі 8 дзяцей. Кожны з іх атрымаў патрэбную краіне спецыяльнасць. Сярод іх чыгуначнік, настаўнік, майстар швейнай вытворчасці, кранаўшчык, майстар-аўтарамонтнік, авіяканструктар, юрыст, шафёр.

У 1976 годзе Вікенція Францавіча Ягелы не стала. Слава пра народнага ўмельца распаўсюдзілася далёка за межы раёна. У 1976 годзе са

спазненнем прыязджалі супрацоўнікі Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі, а ў 1980 – супрацоўнікі Гродзенскага тэлебачання падрыхтавалі дакументальны фільм аб народным умельцы.

Вырабы Вікенція Францавіча Ягелы можа яшчэ і зараз некаму надзейна служаць, цешаць вока і радуюць душу, як і ўсё, што зроблена з душой.

У яго душы агонь гарэў
І сябе і сваіх родных грэў.
Яго рукі, проста залатыя,
Цуды з дрэва стваралі такія,
Што сягоння кожнаму здаецца,
Быццам майстра ў іх сэрца б'ецца.
Быццам хто намаляваў рукою,
А не з дрэва не паслушнага стварыў.
Ён жа справай гэтай дыхаў, жыў…
Успамінаюць і настаўнікам Ягелу.
Кажуць, у яго руках і дрэва пела.
І арыгінальныя сальнічкі,
І чарнільныя прыборы, папяльнічкі,
Нават скрыпачку сам змайстровываў сабе
Сам зрабіў і сам на ёй іграў…
Яго творы, як вада з чыстай крыніцы,
Што ў роднай струменіць Глушыцы.

(М.Сямашка)


Шафа. Знаходзіцца ў Альдоны Валуевіч


Падсвечнікі



Талерка, сальнічка, шкатулка.
Захоўваюцца ў доме Паўла Ягелы в.Страча х.Глушыца



Сувенірны набор: бутэлька з кілішкамі. Падараваны С.М.Налівайка з в. Спонды

В.Ф.Ягела ўзнагароджаны Бронзавым медалём ВДНГ СССР



ВЫСТАВКА ДОСТИЖЕНИЙ НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА СССР

УДОСТОВЕРЕНИЕ
ЗА УСПЕХИ В НАРОДНОМ ХОЗЯЙСТВЕ СССР

Тов. Ягелло
Викентий
Францевич
ПОСТАНОВЛЕНИЕМ ГЛАВНОГО КОМИТЕТА ВЫСТАВКИ ДОСТИЖЕНИЙ НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА СССР
НАГРАЖДЕН
БРОНЗОВОЙ
МЕДАЛЬЮ

М. П. Главный комитет ВДНХ

Постанов. № 

№ 5333

## Глушыца II



Выпіска з гаспадарчай кнігі Спондаўскага сельсавета, 1953 год.
Калгас "Красный маяк":

1. **Валуевіч Міхаіл Міхайлавіч – г.с. , 1896г.**
2. **Валуевіч Галена Нікадзімаўна – жонка, 1896г.**
3. **Валуевіч Ганарата Міхайлаўна – дач., 1935г.**
4. **Валуевіч Мечыслаў Міхайлавіч – сын, 1926г.**

1. **Валуевіч Кляменцій Міхайлавіч – г.с., 1873г.**
1. **Валуевіч Тэафілія Адамаўна – г.с., 1891г.**
2. **Валуевіч Галена Адамаўна – дач., 1930г.**
3. **Валуевіч Іосіф Адамавіч – сын, 1930г.**

1. **Валуевіч Антон Кляменцьевіч – г.с., 1910г.**
2. **Валуевіч Уладыслава Канст. – жонка, 1912г.**
3. **Валуевіч Альдона Антонаўна – дач., 1941г.**
4. **Валуевіч Збыслаў Антонавіч – сын, 1944г.**

1. **Валуевіч Франц Кляменцьевіч –г.с.,1914г.**
2. **Валуевіч Элеанора Іванаўна – жонка, 1926г.**
3. **Валуевіч Лехаслаў Францавіч – сын, 1951г.**
4. **Валуевіч Іаланта Францаўна – дач., 1954г.**

## “Палаючае сэрца” майстра



Сярод імёнаў народных умельцаў, на якія вельмі багата Астравеччына, вылучаецца імя народнага разбяра з Глушыцы Міхаіла Міхайлавіча Валуевіча. Старшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага Дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Ніна Іванаўна Ляшчонак гаворыць: Міхаіл Валуевіч – гэта самародак, гэта глыба! Такіх майстроў у Беларусі толькі двое – ён і Зяляўскі з Віцебшчыны.

Дзядуня Міхалка, як мы яго называлі, пражыў доўгае, цяжкае, амаль пакутніцкае жыццё. Пачалося ўсё з таго, што на свет ён з’явіўся ў 1896 годзе незаконнанароджаным. Маці Міхаліна запісала яго Міхаілам Міхайлавічам, аімя сапраўднага бацькі захавала ў тайне ад усіх. Багатыя сваякі (родны брат Адам, які меў у Вільні два дамы-камяніцы, і стрыечны брат Клеманс, старшыня Жукойненскай гміны) не маглі даравацьь Міхаліне ганьбы і адмовілі ёй ва ўсякай дапамозе. Як трохі крыху падрос, Міхась вымушаны быў пайсці пасвіць кароў да заможнікаў, каб зарабіць сабе на кавалак хлеба дапамагчы маці.

Калі пачалася Першая сусветная вайна, яго адразу ж забралі ў войска. Бачыў Леніна ў Петраградзе ў час рэвалюцыі. Трапіў у палон у Аўстрыю. Даводзілася есці траву і запіваць вадой з ручая. З палону ўцёк і пехатой дабіраўся да роднай Глушыцы. Паўгода доўжылася яго падарожжа. Гэтыя падзеі ён любіў прыгадваць. Мы слухалі і здзіўляліся, якая магутная сіла цягнула яго ў родныя мясціны, якая моц падтрымлівала яго ў нечалавечых умовах. Напэўна, гэта была любоў да айчыны, да роднай зямлі, да сваіх каранёў. Калі ішоў, хаваючыся, лясамі ды балотамі, даводзілася часам есці і сухі конскі гной. А калі, нарэшце, выйшаў у вялікае закарпацкае сяло і ўсцешыўся, што ўбачыць людзей, аказалася, што там пануе эпідэмія тыфу. У якую ні зойдзе хату — усюды ляжаць беспрытомныя ці нежывыя людзі. Так хадзіў з хаты ў хату, пакуль сам не захварэў на тыф. І тады пашкадавала яго адна бабка, у якой ужо памерлі ад хваробы сын з нявесткай, пашкадавала салдаціка, хоць суседка неаднаразова падначвала: каб выганяла з хаты, маўляў, сваіх хворых хапае. І, мусіць, Бог даў рады, што і Міхась ачуняў, і тая бабка з унукам не заразіліся, а якраз у суседкі ўсе паляглі. А як толькі ўстаў на ногі, адразу ж выправіўся зноў у дарогу і ў 1918 годзе вярнуўся ў родную Глушыцу.

Дзед Міхалка вельмі любіў успамінаць тыя падзеі, а яшчэ спяваць бясконцыя, тужлівыя салдацкія песні тых часоў. “Вярнуўся дадому, а тут ні кала, ні двара, няма за што зачапіцца”. Зноў прыйшлося ісці ў “людзі”. Гэтым

разам — у Літву. Маючы прыродны талент да сталяркі, навучыўся там рабіць вокны, дзверы.

Няўрымслівы характар, маладосць не давалі спакойна сядзець на месцы. Завербаваўся ў Карэлію на лесанарыхтоўкі. Успамінаў, што і там намёрзся і нагаладаўся ўволю. Бывала, даводзілася соль есці, але Бог надзяліў яго незвычайным здароўем. Беды і нястачы толькі загартоўвалі яго характар і волю. Быў у Віцебску, Магілёве, Камянцы-Падольскім. “Нагаладаўся, нагараваўся, а багатым не стаў”. Увесь час тужыў па родных мясцінах і ў 1924 годзе вярнуўся на радзіму назусім. Родныя пабудавалі хату, далі каня. Неўзабаве ажаніўся з дзяўчынай з суседняй вёскі Спонды. Нарадзілі дваіх дзяцей і пражылі тут усё астатняе жыццё.

Трэба сказаць, што асоба дзеда Міхалкі цікавіла многіх. Пра яго вынослівасць і ўменне хадзілі легенды. Вясковыя хлапчукі ў свой час бегалі за ім, просячы расказаць што-небудзь з мінулага. І ён расказваў, а калі бываў “у гуморы”, то і паказваў акрабатычныя нумары. Для гэтага выбіраў высокае месца, своеасаблівы подыум, станавіўся на галаву і … счакаўшы, запяваў песню. Гаварылі, што і на вадзе ён трымаўся, як шчэпка — мог сядзець, склаўшы на грудзях рукі і, зноў жа, спяваць або чытаць газету. Пра яго надзвычайны дар яднання з прыродай гаворыць і тое, як ён умеў прыручаць дзікіх жывёл. Памятаю, мама расказвала нам, маленькім, пра ручную вавёрку, якая жыла ў дзеда Міхалкі. Мужчыны раней любілі збірацца гуртам па хатах у карты пагуляць, пагаварыць, пакурыць. А вавёрачка не пераносіла тытунёвага дыму — дзед Міхалка не курыў. Сядзела схаваўшыся. Як толькі хтосьці даставаў кісет з табакай, маланкай падскоквала, выхоплівала з рук табаку і хавала дзе-небудзь пад бэлькай так, што доўга не маглі знайсці. Была і сарока ручная. Расказвалі, як адна кабета ў Трашчанах мыла бялізну на сажалцы, а сарока прысела ёй на плячо, дык тая пачала жагнацца, думала, цуд зрабіўся. Сароку нездарма называюць зладзейкай. Любіла яна ў фортачкі залятаць, а калі на стале стаяла міска з ежай, дык мяса кавалак выхапіць і ўцячэ. А яшчэ дзед Міхалка лісу прыручыў, і, што самае дзіўнае, — нават лясных галубоў.

Яшчэ будучы хлапчуком, калі пасвіў кароў, любіў выразаць розныя фігуркі і цацкі з драўляных нарыхтовак. За гады ліхалецця гэтая цікаўнасць да творчасці не толькі не згубілася, але перарасла ў сур’ёзнае захапленне. І каб не марнаваць час ды не звяртаць увагі на розныя плёткі, узяўся рабіць алтар. Гэта былі 1950-я гады, час ваяўнічага атэізму. Большасць касцёлаў была зачынена, і майстар па памяці зрабіў алтар накшталт таго, які знаходзіцца ў Жалядскім касцёле (работы майстра Яна Буйчыка). Хатні алтар з калонамі, са скразной разьбой расліннага арнаменту. “Людзі прыходзяць, дзівяцца, як выраблена, а я і сам дзіўлюся, што мог так зрабіць”. Да гэтага алтара, калі ён быў пасвенчаны, збіраліся з навакольных хутароў вернікі адпраўляць маёвыя, чэрвеньскія і іншыя набажэнствы.

Затым была сталая работа “Партызан”. Расказваў дзядзька Антось (сусед і сваяк), што партызан той быў у рост чалавека, у шынялі, з гранатай у руцэ, стаяў на калодзе-падстаўцы. Гэтую работу дзед Міхалка вырашыў

паказаць “вучоным людзям” і павёз у музей у Маладзечна. “Павёз я свайго “Партузана” (так ён вымаўляў гэтае слова) на “втамабусе” ў Маладзечна, прынёс у музей, а там двое супрацоўнікаў ледзьве занеслі на другі паверх, у шафу паставілі і закрылі. Прыйшла супрацоўніца музея, за нейкай патрэбай у шафу палезла і ледзь не абамлела: чалавек стаіць у шафе!”. Дзеда Міхалку вельмі пацяшала гэтая гісторыя…

Пішу гэтыя радкі, і ажывае ў памяці яго спакойны твар, няспешная, характэрная гаворка. Ён мог гаварыць бясконца, калі ўспамінаў што-небудзь з пераджытага. Заплюшчваў вочы (напэўна, яму так лепш успаміналася) і гаварыў, гаварыў…

У працы дзед Міхалка быў таксама няспешны, хаця працаваць любіў і не баяўся нават самай цяжкай працы. Калі пачынаў работу, то мог і ночы напралёт працаваць. Нашы вокны былі амаль насупраць, і мама часта гаварыла: “Зноў святло ў Міхалкі да паўночы гарэла, відаць, новую работу распачаў”.

Хаця за “партызана” ніхто не заплаціў (толькі на дарогу далі тры рублі ды гасцініцу аплацілі), такія дробязі не маглі спыніць майстра! Галоўнае, што гэтая работа была яму па душы, ды і людзям падабалася. З новым натхненнем ён узяўся за працу. Узоры некаторых работ браў у часопісах. Паглядзіць, як “вырысавана”, і думае: “Няўжо я так не зраблю?” рабіў дзве калоны вітыя з падстаўкамі. На падстаўках выразаны, нібы жывыя, дубовыя лісты. Дзядзька Антось у 1956 годзе прывозіў ксяндза з Лынтуп да хворага бацькі, тады ж і алтар пасвенціў. Ксяндзу спадабаліся работы Валуевіча: дзве калоны з падстаўкамі ён забраў для Лынтупскага касцёла, а майстра запрасіў аздобіць касцельны алтар.

Потым была зроблена яшчэ адна калона-“вяроўка”, якая знаходзілася ў Гродзенскім Дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі. Браўся і за партрэты палітычных дзеячаў. Зрабіў бюст Леніна з бародкай, якому не суджана было пабачыць свет — пасек сын, калі паміж імі пачаліся звадкі.

Калі займаўся сваёй любімай справай, “так хораша на душы станавілася, здаецца, песні спяваў бы!”. Але ж большасць акружаючых яго не разумела: кпілі, прыклейвалі крыўдныя мянушкі, падначвалі сына. Пачаліся сваркі з дарослымі дзецьмі. Але час расставіў ўсё на свае месцы. Сын ажаніўся і выехаў у Калініград, дачка выйшла замуж, а жонка не толькі не пярэчыла свайму мужу, але верыла і ганарылася ім.

Валуевіч быў глыбока веруючы чалавек, вёў спартанскі лад жыцця: не піў, не курыў, а ў час Вялікага Посту ўсе сем тыдняў акрамя хлеба ды вады нічога не ўжываў.

Усе яго работы можна падзяліць на дзве асобныя групы. Адну складаюць творы рэлігійнай тэматыкі, якая заўсёды вабіла як верніка. “Маці Божая, каралева неба і зямлі”, “Маці Божая непакаляная”, “Хрыстос з палаючым сэрцам”… Мне здавалася, што “Маці Божая, каралева неба і зямлі” вельмі падобная да яго жонкі Гелены. Будучы маленькай, ды і дарослай

таксама, я вельмі любіла, калі ніхто не бачыў, з нейкім душэўным трымценнем дакрануцца да працягнутых рук яго “Маці Божай”.

Іншая фігура ў “Маці Божай непакалянай” — узнёслая, занадта выцягнутая. Маленькая галава пасаджана на вузкія плечы, рукі і ногі перабольшана маленькія. У афарбоўцы карыстаўся бела-блакітна-сіняй колеравай гамай, што стварала нябеснае ўражанне.

“Хрыстос з палаючым сэрцам” — апошняя работа майстра. У ёй моцна парушаны прапорцыі, але з гэтае прычыны вобраз, можа, нават яшчэ больш выразны, эмацыянальны, запамінальны.

Дарэчы, адна з яго Маці Божых сёння знаходзіцца ў касцёле вёскі Струнайціс у Літве.

Другую групу яго работ складаюць хатнія вырабы з матывамі расліннага арнаменту, якія больш прызначаліся для ўпрыгожвання побыту, чым карыстання. Мастацкая выразнасць дасягаецца тут за кошт індывідуальнай творчай манеры мастака. Збан са здымнай накрыўкай-вечкам, упрыгожаны разьбой, складзенай з кветак і трылісьнікаў. Дзежка, аздобленая экзатычнымі раслінамі. Дзежка на трох выгнутых ножках, высечаная з цэльнага кавалка дрэва. Вітая калона з капітэлем карынфскага ордэна. Часалка для лёну. Грэбень. Усяго і не пералічыць…

Для сваёй працы браў ліпу. “Драўніна яе мяккая, цёплая, і не шчэпіцца”, — так ён гаварыў. Увогуле, да дрэва майстар ставіўся нібыта да таго, чаму нададзена нейкая таямнічая звышсіла.

А прызнанне да майстра ўсё-такі прыйшло. У 1982 годзе вандраванне экспедыцыйнымі сцежкамі прывяло супрацоўнікаў Гродзенскага Дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі (на той час Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі) на хутар Глушыца. Тое, што яны там убачылі, прымусіла разгубіцца нават бачыўшых многае музейшчыкаў. Усе свае скульптуры майстар падарыў музею, толькі аўтар завяшчаў аддаць пасля сваёй смерці. Музейшчыкі не забывалі Валуевіча, пісалі лісты, прыязджалі пагасціць, падыхаць чыстым паветрам на яго радзіме. Многія перыядычныя выданні пачалі пісаць у той час пра майстра. Словам, апошнія гады жыцця дзеда Міхалкі былі гадамі трыумфу і глыбокай павагі. Разам адсвяткавалі 90-годдзе з дня яго нараджэння. Спондаўскія культработнікі падрыхтавалі канцэрт, запрасілі супрацоўнікаў Гродзенскага тэлебачання, якія зрабілі цудоўны фільм пра дзядуню Міхалку.

У маі 1989 года Міхаіла Міхайлавіча не стала. Пахаваны ён на Спондаўскіх могілках побач з маці і жонкай.

У жніўні таго ж года быў разабраны і перавезены ў Гродна і алтар, які завяшчаў музею майстар.

У Спондаўскай бібліятэцы пастаянна дзейнічае выстава, прысвечаная народнаму разбяру. Сабраны амаль усе фотакопіі работ Валуевіча (за выключэннем “Партызана”, які знік бясследна, і “Маці Божай”, якая знаходзіцца ў Струнайцісе), усе артыкулы з часопісаў і газет, якія пісалі пра майстра.

Памяць пра народнага разьбяра жыве сярод нашых людзей, для нас ён застанецца сімвалам Бацькаўшчыны, непадуладным часу.

*Сям’я: сын Мечыслаў, дачка Ганарата і зяць Раймонд. 1986 год*



## З успамінаў

*За ўсе гады падрыхтоўкі музея да адкрыцця мы не сустракалі такіх скульптур, як Вашы. Вы, Міхаіл Міхайлавіч, можаце ганарыцца, што жыццё пражылі недарэмна, добра, што такія людзі ёсць на зямлі гродзенскай.*

Ніна Ляшчонак



З Н.Ляшчонак – галоўнай захавальніцай фондаў Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі. 1985 год.

*Имел особый подход к людям, умел вызвать интерес. Мы ходили, бегали за ним по пятам. Особенно удивляла и осталась неразгаданным его умение держаться на воде, как поплавок. Но, видимо, научиться этому нельзя - это дар.*

*Помню, его первую работу – колхозницу. Спилил толстую ольху рядом с домом, из которой довольно быстро сделал скульптуру. Колхозница была почти в рост человека, в одной руке держала сноп с колосьями, в другой – серп. Но скоро эта скульптура разорвалась. После этого стал работать с липой. Текстура этого дерева оказалась более податливой и надёжной.*

Лехослав Волуевич

***Я очень любил Михаила. Он часто бывал у нас. И хоть сказок не рассказывал, но с ним было интересно. Однажды у нас оставил скульптуру «Партизан». Помнится, что он не очень соответствовал «духу Партизана», потому что на нём то ли шапка была с красным околышком, то ли погоны. Меня, тогда ещё пацана, очень заинтересовала причёска – она была мягкой и эластичной. Пришлось уточнить. Оказалось, что волосы он делал из хлебной крошки.***

Рышард Пометько

Успамінае Валянціна Антонаўна Лаўрыновіч з в. Спонды:

***“Я часта прыбягала ў Глушыцу праведаць сваю цёцю Гэлену. Сябравала таксама з іх дачкой Ганаратай . У яе таксама былі “залатыя рукі”: з хлеба ўмела конікаў ляпіць, з сасновай кары розныя караблікі выразала і раздавала мясцовым хлапчукам. Умела ткаць кросны, вязаць прыгожыя рэчы. А яшчэ я ў яе вучылася сшываць с паштовак шкатулкі – у той час гэта было ў модзе. Але, бадай, ні ў каго больш ні атрымлівалася так прыгожа, як у Гангараты. Відаць талент ад бацькі перадаўся”.***



Святкаванне 90-годдзя з дня нараджэння дзеда Міхалкі. 1986 год.

Унучка Хэлена з дзецьмі: Светай і Аляксандрам.





Унучка Хэлена з мужам Віктарам пад час наведвання дзедавай Радзімы. Каля Свірскага касцёла. 2005 год, чэрвень

Хэлена таксама мае здольнасці да розных прыкладных рамёстваў. Яна сама з усмешкай гаварыла: “Відаць, нейкія здольнасці ад дзеда перадаліся”. Яе вязаныя і сшытыя рэчы выкананы настолькі прафесійна, што з цяжкасцю можна паверыць, быццам яны не ад модных куцюр’е.

**<u>Лепшыя работы майстра</u>**



Алтар



Маці Брожая Беззаганная



Хрыстос з палаючым сэрцам



Пакой, у якім жыў
і працаваў майстар



Інструменты,
якімі карыстаўся
майстар



Гэты Анёл у ўстаноўлены
на магіле М.Валуевіча.
Беларускага тэлебачання
Выканаў гэту скульптуру
мастак з Віцебска
Юрый Чапскі.

Здымачная група канала
ОНТ. 10 чэрвеня 2005 года
быў паказаны фільм
пра Глушыцу.

## Глушыца I



*“Гляджу на фота Глушыцы і ў душы такі боль,*
*такое пачуццё суму, адзіноты і сіратлівасці...”*
*(з ліста Г.Семашкевіч)*

Выпіска з гаспадарчай кнігі Спондаўскага сельсавета, 1953 год.
Калгас імя Сталіна:

1. **Памецька Ізыдор Паўлавіч – гл.с., 1884г.**
2. **Памецька Мальвіна Мікалаеўна – жонка, 1890г.**
3. **Памецька Рышард Сідаравіч – сын, 1944г.**

1. **Станевіч Казімір Іванавіч – гл.с., 1869г.**

1. **Станевіч Антон Казіміравіч – гл.с.,1915г.**
2. **Станевіч Станіслава Францаўна – жонка, 1918г.**
3. **Станевіч Геноэфа Антонаўна – дач., 1941г.**
4. **Станевіч Марк Антонавіч, сын, 1947г.**
5. **Станевіч Фелікс Антонавіч – сын, 1949г.**

1. **Памецька Іосіф Паўлавіч –гл.с., 1882г.**
2. **Памецька Феліцыя Адольфаўна - жонка, 1892г.**
3. **Памецька Яніна Іосіфаўна – дач., 1924г.**
4. **Памецька Франц Іосіфавіч – сын, 1928г.**
5. **Памецька Ядвіга Іосіфаўна – дач., 1930г.**
6. **Памецька Ганна Іосіфаўна – дач., 1936г.**
7. **Памецька Зофія Іосіфаўна – дач., 1938г.**

## ГЛУШЫЦА

**Родны мой куточак,**
**Бацькаўшчына міла**
**Да цябе так доўга**
**Сэрцам я спяшыла!**

**А сённня ў месцы гэтым**
**На ростанні стала**
**Цябе, мой куточак,**
**Зусім не пазнала!**

**Куст бэзу схіліўся**
**Над камнем палёвым**
**А жыў тут калісці**
**Станевіч Антоні.**

**Гладжу камень падмурку**
**На сонцы нагрэты,**
**Бацькоўская хата**
**Была ў месцы гэтым.**

**Голас мамы усплывае**
**У памяці, як рэха,**
**Калі звала дадому**
**Нас, маленькіх дзетак.**

**А непадалёку-**
**Камень замрушэлы,**
**Стаяла тут хата**
**Дзядулі Казімера.**

**Збожжа тут радзіла:**
**Лён, авёс, пшаніца,**
**Звалі маю вёску**
**«Засценак Глушыца»**

**Яшчэ між людзьмі**
**Звалі Шульгачамі-**
**Баярын Шульга**
**Зямлі гэтай быу панам.**

**Над сажалкай самай**
**Тут хата была**
**Язэпа Памецькі**
**Сям'я тут жыла.**

**А побач, за плотам,**
**Была забудова**
**У садзе вялікім**
**Брата яго Ізыдора.**

**Плыло тут жыццё,**
**Як вада ў струменні**
**Ці добра, ці дрэнна,**
**У працы, у цярпенні.**

**Як хвалі, успаміны**
**Заліваюць грудзі:**
**Няма ўжо тых хатаў,**
**І дзе тыя людзі?**

**Да смерці па роднай**
**Зямлі сумавалі,**
**Ды ў чужой старонцы**
**Цяпер пахаваны.**
**У старым садзе вецер**
**Яблыні цалуе,**
**Клёкат бацяновы**
**Недзе у лузе чую.**
**Пры каменні кленчу,**
**Нагрэтым на сонцы.**
**Бывай, Бацькаўшчына,**
**Родная старонка!**
**Сілы не хапае,**
**Іду, аглянуся,**
**Бывай, мой куточак,**
**Можа йшчэ вярнуся.**

## Сямейная дынастыя фізікаў - ядзершчыкаў
### *Бацька*



*"Я давно не был в родных краях, но вспоминаю о них, пожалуй, каждый день..."*
*(З ліста Р.Памецька)*

Рышард Сідаравіч Памецька – асоба амаль што легендарная ў нашай мясцовасці. Яго прыводзілі ў прыклад настаўнікі, каб зацікавіць да вучобы лянівых вучняў, аб ім успаміналі, калі гаварылі пра любоў да Радзімы, да маці, да роднай мовы, на яго прыкладзе бацькі навучалі дзяцей, як трэба дабівацца ў жыцці пастаўленай мэты.

Дзяцінства Рышарда Сідаравіча прыпадае на, бадай, самы складаны і цяжкі перыяд нашай гісторыі. Пасляваенная разруха, затым калектывізацыя, беднасць, нястача, недахоп інфармацыі. Але цвёрдая воля, мэтанакіраванасць ды надзвычайныя здольнасці дапамаглі хлопцу дасягнуць сваёй мэты, якая з'явілася ў яго амаль з малых гадоў: "Не памятаю, колькі мне тады было год (3-5?), але неадольная цікавасць да тэхнікі ў мяне ўзнікла, калі я ўбачыў невялікае драўлянае кола з лапаткамі (млын). Сусед, Антон Станевіч, чалавек масцеравіты і добры, каб пацешыць дзетвару паставіў гэтае кола ў ручаёк на рагульці, і яно круцілася. Не мог адарвацца ад такога "цуда" і гадзінамі праседжваў каля гэтага млына, спрабуючы ўсведаміць, як яно працуе" – успамінаў Рышард.

Нарадзіўся Р.С. Памецька ў засценку Глушыца. Бліжэйшая пачатковая школа знаходзілася ў Трашчанах, і яго, разам з суседкай Геняй Станевіч і сябрам Тадэвушам з суседняга хутара, адправілі вучыцца туды. "Настаўніца, Зінаіда Сцяпанаўна, была зусім маладой, - успамінае Рышард, - насіла светлае плацце і валасы, укладзеныя ў выглядзе какошніка. І здавалася вельмі прыгожай. І вось, гэтая прыгожая настаўніца сказала, што маё імя занадта складанае (?!) і на сшытках яна будзе пісаць "Рыгор". Потым я ў нечым правініўся, напэўна, перад ёй і, калі мы над нечым працавалі, падыйшла і ціхенька шапнула на вушка: "Рысь-дрысь". Дома, як расказвала мама, я плакаў і прыгаворваў, што у школу больш не пайду увогуле, а калі і пайду, то ў іншую, дзе ведаў "добрую" настаўніцу. Бацькі, зразумела, і слухаць на захацелі пра іншую школу, і прыйшлося змірыцца".

Наступны, ужо больш сур'ёзны інтарэс да тэхнікі таксама звязаны са Станевічамі. У іх быў дэтэктарны прыёмнік на навушніках – каштоўная рэч, амаль раскоша па тых часах і, безумоўна, гэта запала ў душу юнага аматара. У гэты час ён ужо чытаў, пазычаючы ў старшакласнікаў кнігі па фізіцы, у якіх былі схемы электрамагнітаў, просценькіх электрарухавікоў. І Рышард пачынае вазіцца з правадамі. Першым зрабіў электрамагніт. Правадоў у ізаляцыі не было, таму прыходзілася маляваць маслянымі фарбамі (фарба – ізалятар), сушыў і намотваў. А колькі радасці было, калі ад батарэйкі ён стаў прыцягваць жалезкі, а рухавічок закруціўся! Ведаючы яго інтарэс да такіх рэчаў, нехта дапамагаў дастаць провад, нехта – дэталі.

Пасля заканчэння 4-х класаў Трашчанскай ПШ, пайшоў у Жукойне-Жалядскую васьмігадовую школу. З гэтае пары усё пайшло хутчэй і сур'ёзней.

Пад заклад у дзесяць рублёў ён стаў браць кнігі ў раённай бібліятэцы ( раённы цэнтр тады быў у Свіры, за 17 км.), рэгулярна выпісваў часопісы “Радио” і “Знание – сила”. У той час працавала так званая база “Пасылторга” І Рышард выпісваў сабе патрэбныя дэталі. Трэба адзначыць, што ў той час з грашыма было вельмі цяжка, але бацькі не пярэчылі і, што маглі, выдзялялі на расходы. Акрамя таго, стараўся зарабляць сам. Асновай яго заробку былі журавіны, за якімі бегаў з жанчынамі з суседняга засценка на “Азярцо” за 10 км. Здавалі у Гінкішкі па 20 кап. Збіраў Рышард спрытна, хутчэй за жанчын і за сезон набіраў каля 100 кг. На атрыманыя грошы купіў фотаапарат.

Свой першы лямпавы прыёмнік ён сабраў ужо ў шостым класе. З гэтага ж часу людзі сталі прывозіць да яго на рамонт радыёпрыёмнікі. А па выхадных з фотаапаратам і дэталямі для радыёпрыёмніка Рышард стаў ездзіць на веласіпедзе, прапануючы свае паслугі. У той час папулярнымі былі лямпавыя радыёпрыёмнікі “Родина”. На фотаздымках і рамонце зарабляў адносна нядрэнна – грошы выкарыстоўваў для пакупкі запчастак. Для прыёмнікаў патрэбны былі вялікія і дарагія батарэі, Рышард купіў акумулятар і на страсе дома устанавіў вятрак, які круціў маленькую дынамку, што выкарыстоўвалася у веласіпедах, і тым самым зараджаў батарэю. Прыкладна у той жа час у Расіі з’явіліся першыя паўправадніковыя трыёды замест лямп. Яны спажывалі мала энергіі і маглі працаваць на батарэйках для кішэннага ліхтарыка. На гэтых самых першых у Расіі трыёдах маркі ад П1А да П1Е Рышард сабраў невялікі прыёмнік, які якраз змяшчаўся ў школьны партфель. Хацелася пахваліцца, і ён узяў яго ў школу, але асаблівага ўражання на акружаючых ён не зрабіў — працуе, ну і што? А для яго самога галоўным было тое, што сабраны гэты прыёмнік на першых у Расіі паўправадніках.

Заканчваць школу (9-10 клас) трэба было ў Жукойнях Страчскіх, як у нас іх назыввалі ў адрозненне ад Жукойняў-Жалядскіх. Дырэктар СШ Іван Паўлавіч Журовіч адразу заўважыў здольнасці хлопца і адносіўся да яго па-бацькоўску. Яму даверылі весці ў школе радыёгурток. Дырэктар вырашыў усіх хлопцаў пасля 10 класа прыстроіць у ваенныя вучылішчы. Так і аказаўся Рышард у Даўгаўпілсе ў авіяцыйна-тэхнічным вучылішчы. Праз месяца паўтара перавялі ў другое – ракетнае, якое толькі стваралася, дзе высветлілася, што ён ім па нейкіх там параметрах не падыходзіць, і прапанавалі вярнуцца ў ранейшае. Але юнак вырашыў для сябе, што з ваеннай кар’ерай пакончана, і вярнуўся дадому. Збіраўся падрыхтавацца і паступаць у Беларускі Політэхнічны Інстытут, а пакуль, муж той жа суседкі, з якой разам хадзілі ў школу, Генадзь Семашкевіч, прапанаваў не марнаваць час ды уладкавацца на працу. Дапамог прапісацца у Лентварысе (Літва), і Рышард стаў працаваць на Вопытным заводзе валакністых вырабаў. Завод быў маленькі – усяго 200 чалавек працуючых. Працаваць падабалася, і за паўтара года, што адлрацаваў там, адзін год яго партрэт правісеў на Дошцы гонару. Як перадавік вытворчасці, выступаў па рэспубліканскаму радыё. І ў гэты ж час з’явіўся асаблівы інтарэс да вучобы. Перавыконваючы планавыя заданні на 115%, у яго яшчэ заставаўся час для самаадукацыі. Браў у бібліятэцы кнігі па

розных галінах ведаў, чытаў шмат мастацкай літаратуры, некалькі кніг на нямецкай мове і, канешне ж, фізіку і матэматыку, якія вывучыў дэталёва ў аб'ёме 3-томных ВУЗаўскіх падручнікаў. Праз год, як і марыў, падаў дакументы ў Політэхнічны, але запрашэння на экзамен не атрымаў, падобна, што пісьмо з выклікам прапала, таму што, праз месяц прыйшлі назад дакументы "у сувязі з неяўкай на экзамены". На наступны год вырашыў паступаць у МІФІ (Маскоўскі інжынерна-фізічны інстытут). Ён лічыўся адным з самых прэстыжных навучальных устаноў СССР, і калегі па працы , ведаючы, што ён з вёскі, нават не раілі і спрабаваць туды паступаць.

Конкурс быў памяркоўны, прыкладна 5 чалавек на месца. Жылі ў вялікай спартыўнай зале, народу было шмат, але рады абітурыентаў хутка радзелі. Прафіліруючыя – фізіку і матэматыку – вусна і пісьмова ён здаў на 5. З групы ў 150 чалавек з такімі адзнакамі былі толькі двое. Залічаны ў студэнты быў безумоўна. 50 студэнтаў адправілі ў Обнінск, прыкладна за 100 км. ад Масквы, дзе быў пакладзены пачатак новаму інстытуту – адразу на узроўні філіяла. Зараз гэты інстытут завецца ОГТУ АЭ (Обнинский Государственный Технический университет Атомной Энергетики) Пасля яго заканчэння стаў працаваць у Обнінскім фізіка-энергетычным інстытуце, дзе ў 1954 годзе была запушчана першая ў свеце атамная электрастанцыя, што дало магутны імпульс для развіцця атамнай энергетыкі. Доўгі час інстытут працаваў у абстаноўцы поўнай сакрэтнасці, лічыўся паштовай скрынкай. Зараз усякая сакрэтнасць ужо страціла сэнс, паколькі са спадарожнікаў падрабязна бачна ўсё, што дзееца на зямлі. У той час працавалі ў інстытуце 10 000 чалавек. Праз пару год быў назначаны кіраўніком групы, і ў гэты ж час паступіў у аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю. Доктарскай не пісаў, хаця быў навуковым кіраўніком у некалькіх суіскальнікаў кандыдацкай ступені.

Шмат напісана навуковых артыкулаў і дакладаў для расійскіх і замежных канферэнцый, зборнікаў. Зроблена 10 вынаходніцтваў у галіне атамнай энергетыкі, якія давалі альбо эканамічную выгаду, альбо гарантыі бяспечнай работы той ці іншай ядзернай устаноўкі, або былі навінкамі па сваёй сутнасці.

На эксперыментальных устаноўках выкананы работы па кантрактах з замежнымі фірмамі ЗША, Аргенціны, Рэспублікі Карэя, Кітая, Францыі і, зразумела, для Расіі. Для абмеркавання работ, удзелу ў канферэнцыях наведаў многія краіны: ЗША, Аргенціну, Карэю, Ізраіль, Швецыю, Швейцарыю і інш. Шматразова бываў у краінах былога сацлагеру.

Больш дзесяці год працуе начальнікам лабараторыі, якая носіць назву "Лабараторыя разлікова-эксперыментальных даследаванняў цеплагідраўлічных характарыстык элементаў актыўных зон і контураў цыркуляцыі ЯЭУ". Тэматыка распрацовак: "Водаахалоджвальныя устаноўкі для энергазабяспячэння". Гэты напрамак зараз стаў больш інтэнсіўна фінансавацца ў сувязі з тым, што Расія можа стаць толькі пастаўшчыком сыравіны - урану, уранавай руды, а патрэбна вырабляць свае элементы і ўстаноўкі, прычым такога ўзроўню, які зробіць іх канкурэнтаздольнымі.

Магутнасць расійскіх ЯУ пакуль што адстае ад лепшых замежных, але асобныя элементы цэняцца высока, карыстаюцца попытам і замежныя партнёры гавораць: чаму б не паспрабаваць удасканаліць канечны прадукт – установку у цэлым? Так што, працаваць ёсць над чым і лабараторыі, і асабіста Рышарду Сідаравічу.

Справу, якой ён займаецца, лічыць для сябе цікавай ужо тым, што яна не руцінная, не адно і тое ж з дня на дзень, з году у год, што магло б і надакучыць, але справа творчая, увесь час нешта новае, іншае, ёсць неабмежаваныя магчымасці для новых адкрыццяў.

Хоць амаль увесь свой час аддае працы, навуковым распрацоўкам, але ёсць у яго і занятак для душы. Яго хоббі – разьба па дрэву, цікавасць да якой узнікла яшчэ ў дзяцінстве ад дзеда Міхалкі з суседняга хутара Глушыца, які славіўся сваімі драўлянымі скульптурамі. Памецька свае вырабы, падобна як і Міхалка, выразаў уручную, Яго вырабы мелі функцыянальны накірунак – гэта, у асноўным, была мэбля: сталы, крэслы, полачкі для кніг, рамкі для партрэтаў і карцін. Выкарыстоўваў іх у асноўным для сябе і ў якасці падарункаў блізкім, сябрам і саслужыўцам. Выразаў галоўным чынам з дуба. “Ёсць два тыпы дрэў, структура якіх мяне цікавіць – гэта дуб і вольха”- расказваў Рышард Сідаравіч. Як сказаў яго сын Сяргей: “Мэбля бацькі была прыгожай, арыгінальнай і... пазнавальнай” Вырабы Памецькі неаднаразова экспанаваліся на гарадскіх выставах і былі адзначаны ўзнагародамі.

Нарадзіўшыся ў цудоўным, жывапісным азёрным краі з бяскрайнім блакітным небам, са спеўным шумам лясоў, з бяздоннымі празрыстымі крыніцамі, дзе самае чыстае паветра і самыя звонкія птушыныя песні, не мог Рычард Сідаравіч не застацца ў душы лірыкам. Вельмі любіць, шмат ведае і сам піша вершы. Калі бывае ў лірычным настроі, то любіць дэкламаваць вершы любімых паэтаў: А. Блока, Р. Бёрнса, Цютчава, Ясеніна, Метэрлінка, Шчыпачова і...свае. Адзін з яго вершаў (шестистишие) я запісала:

Летний дождь, на тебя он похожий,
Он, как платье твоё, шелестит.
Он придёт и обнимет он тоже
И собою весь мир заслонит.
И целую я струи живые –
Эти руки твои молодые.

Асабіста я ўпершыню ўбачыла Рышарда Сідаравіча, калі ён прыязджаў на адпачынак да маці ў Глушыцу. Заўсёды ён быў заняты нейкай справай: яго можна было ўбачыць і з касой у лузе, і з сякерай ды пілой, прыводзячы ў парадак хатнюю гаспадарку, якая, як вядома, без мужчынскіх рук (маці апошні час жыла адна) хутка прыходзіла ў заняпад. Трэба сказаць, што з “прамудрасцямі” сялянскай працы ён спраўляўся гэтак жа бліскуча як і з вучобай.

Добра памятаю яго маці – цёцю Мальвіну. Гэта была надзвычай добрасардэчная, шчырая, мудрая жанчына. Калі сын паехаў вучыцца, яна ўзяла

на выхаванне дзяўчынку з беднай мнагадзетнай сям'і ў Спондах. Апранала, карміла і выхоўвала, як сваю. А яшчэ яна была руплівай, стараннай і проста таленавітай гаспадыняй. Іх дом вылучаўся сваёй утульнасцю і чысцінёй, асабліва ў тыя дні, калі цёця Мальвіна рыхтавалася да якога-небудзь свята: чысціла, мыла, шаравала, упрыгожвала абразы і абажур новымі выцінанкамі з набіўнымі ружамі. І на свята дом ззяў, як вясенняе сонейка, як духмяныя пышныя пірагі на стале. Здавалася, што сам Хрыстос заходзіў у гэты дом і радасна ўсміхаўся. І ўсіх, хто да іх заходзіў, цёця Мальвіна абавязкова частавала духмяным чаем з дамашнім пячэннем і абавязкова з мёдам са сваёй пасекі – адны з нямногіх у акрузе яны трымалі пчол.

Варта сказаць і пра сыноўнюю любоў Рышарда Сідаравіча да маці. Як толькі атрымалі кватэру, адразу ж забраў маці да сябе ў Обнінск. Кожнае лета сам альбо жонка прывозілі цёцю Мальвіну на радзіму, да сястры ў Сponды.

Нягледзечы на поспехі, наш зямляк застаўся дэмакратычным, сціплым, даступным для зносін чалавекам. У ім нічога няма ад позы. Што многіх здзіўляла, малады вучоны, прыязджаючы на радзіму, заўсёды размаўляў па-беларуску. Знаходзіліся і такія, што гаварылі: “А ці ж праўда, што ён вучоны – гаворыць жа па-беларуску?!” На што я ім адказвала: “Ён можа і па-ангельску, але ж вы тады нічога не зразумееце”. На самой справе Памецька свабодна валодае англійскай мовай, памятае нямецкую. А тое, што не забыў родную мову, якой навучыла яго маці, сведчыць аб высокай культуры гэтага чалавека, яго сыноўняй любові да свайго народа, да зямлі, дзе нарадзіўся і вырас.

## З УСПАМІНАЎ

Нядаўна былы аднакласнік Рышарда Сідаравіча Памецькі **Алёйза Антонавіч Заянчкоўскі** расказваў мне выпадак з дзіцячых гадоў.

***–Мы з Рышардам сябравалі. Ён быў вельмі добры і спагадлівы. Аднаго разу, як не было дома яго бацькоў, прывёў ён мяне ў бакавушку, дзе стаялі ёмістасці з мёдам, падаў кубак і кажа: “Пі, колькі хочаш!” і ведаеш, колькі я выпіў? Шэсць кубкаў! І яшчэ піў бы, але прыехалі бацькі.***

З успамінаў аднакласніцы Генуэфы Антонаўны Семашкевіч:

***–Калі працаваў у Лентварысе, ён нікуды не хадзіў акрамя бібліятэкі, нават у кіно. На стале ляжаў такі вялікі стос кніг, што яго самога з-за іх не было відаць. Гаспадыня, дзе ён жыў, вельмі здзіўлялася яго стараннасці.***

**З успамінаў** Яніны Браніславаўны Канчанін **з вёскі Гінкішкі, якая вучылася разам з Рышардам Сідаравічам у Жукойненскай сярэдняй школе:**

***–Ён прыйшоў да нас у дзевятым класе. І неяк адразу заваяваў агульную павагу аднакласнікаў. У школе Рычард вёў гурток па радыётэхніцы і хадзіў заўсёды з падручнікам фізікі падпахай.***

Успамінаюць аднавяскоўцы:

***–Прыязджаючы ў адпачынак, Рышард і хвіліны не сядзеў склаўшы рукі. Калі не было работы ля матчынага дома, дапамагаў іншым, зазвычай нямоглым і адзінокім – абкошваў падворкі, рамантаваў агароджу. Ведаючы яго добрае сэрца, людзі ішлі да яго з самымі разнастайнымі просьбамі: перакласці з замежнай мовы тэкст, адрамантаваць тэлевізар, дапамагчы падрыхтавацца да экзамену па фізіцы. Не адмаўляў Рышард Сідаравіч і тым, хто звяртаўся да яго з просьбай завезці хворага ў бальніцу***

З успаміну Галіны Сігізмундаўны Ромаш**.**

***-Рышард Памецька – мой траюрадны брат, радня па майму бацьку Сігізмунду. Бацькі гасцілі ў нас і мы ў іх. А як засталася адна маці Рычарда, то я заходзіла да яе. Мы гутарылі з ёй доўга, расказвала пра сына, нявестку, мы пілі чай, частавала мяне мёдам. Адзін раз з Рычардам хадзілі на танцы ў Спонды. Разумны быў хлопец, кемлівы і мудры. Нездарма ж ён стаў вучоным-фізікам. Ганаруся ім!***



Хата, дзе нарадзіўся Р.С.Памецька





Бацькі: Ізыдор і Мальвіна



З сябрамі: суседам Маркам
Станевічам і Генам Місюком



Адзін з фотаздымкаў, якія Рычард рабіў на заказ - дажынкі: святкавала брыгада №3, у якую ўваходзілі чатыры Глушыцы і Акартэлі.



Выпускны  клас Жукойненскай СШ.
Другі злева –  Р.Памецька



**“Пометько Р.С. Перевыполняет плановые задания выполнил нормы выроботкі на 115%”**
***(фотаздымак і надпіс з Дошкі Гонару Вопытнага завода валакністых вырабаў г. Лентварыса)***





Студэнт Рычард
на канікулах.
Нарыхтоўка сена.

Вяселле





***Міжнародны семінар у Обнінску***



шт. Коннектикут, Аппачи горы США






*<u>Здымкі, зробленыя Памецькамі пад час наведвання Бацькаўшчыны. Жнівень 2004г.</u>*

**Сустрэча з землякамі**











**Сцежкі дзяцінства**

## Сын



Бацька і сын Памецькі – сямейная дынастыя вучоных фізікаў-ядзершчыкаў. Рышард Сідаравіч гаварыў: “Я не падштурхоўваў, не накіроўваў сына, але вельмі задаволены яго выбарам прафесіі. Тое, што ён пайшоў па бацькоўскіх слядах, сведчыць аб тым, што аўтарытэт бацькі ў сям’і высокі.Яшчэ ў школе любімымі прадметамі Сяргея
 былі фізіка і матэматыка і тое, што пайшоў вучыцца ў Обнінскі філіял Маскоўскага інжынерна-тэхнічнага інстытута лічыць заканамернасцю.

Складалася ўсё не зусім проста. З другога курса прызвалі ў армію, папаў у пагранвойскі. Служыў на Паміры, а на другім годзе службы перакінулі ў Афганістан, ахоўваць афгана-пакістанскую граніцу. Узнагароджаны двумя медалямі, але гаварыць аб іх адмовіўся, сказаў, што яго асаблівай заслугі ў гэтым няма і што амаль кожны другі быў узнагароджаны такімі медалямі. Хаця баявых дзеянняў там не было, але многія вярнуліся з войска траўміраванымі псіхічна. Сяргею пашанцавала - ён вярнуўся здаровы і працягнуў вучобу ў інстытуце.

На апошнім курсе быў абмен студэнтамі з Французскім універсітэтам: французскія студэнты прыязджалі вучыцца ў Обнінск, а расійскія – у Францыю. Выбралі сем лепшых студэнтаў і паўгода навучалі іх французскай мове. З гэтых сямі затым выбралі траіх – ужо па прыкметах здольнасці да мовы. Сяргей аказаўся сярод выбраных. І паехаў вучыцца ў Францыю, ва універсітэт Праванса. Там жа абараніў дыплом, а потым і ў Расіі (інакш дыплом лічыўся б несапраўдным). Там жа, у Францыі, яму прапанавалі аспірантуру. Згадзіўся і паспяхова закончыў яе па тэме: “Цяжкія аварыі ядзерных і энергетычных установак і паводзіны расплаўленай актыўнай зоны рэактара”.

Пасля аспірантуры вярнуўся ў Расію. Стаў працаваць у Обнінскай фірме, якая займалася вырабам трэнажораў для навучання персаналу атамных электрастанцый. Вучыцца непасрэдна на станцыях ужо позна – там усё павінна функцыянаваць нармальна, а ўсялякія аварыйныя сітуацыі адпрацоўваюцца на трэнажорах. У гэтай фірме Сяргей адпрацаваў два гады. Аднойчы, калі паехаў у камандзіроўку ў Францыю, яму прапанавалі цікавую работу ў фірме КОРУС

каля Грэнобля. Калі пачынаў там працаваць, у фірме быў вялікі праект “Эверэст” – па вырабу трэнажораў для савецкіх ядзерных рэактараў В–440. СССР у той час набудаваў шмат станцый для нашых славянскіх брацкіх народаў – Чэхіі, Славакіі, Балгарыі і г.д. Для ўсіх фірма выраблялa трэнажоры. Сяргею ўдалося пасупрацоўнічаць з многімі калегамі з замежных краін. Гэты праект быў паспяхова завершаны, а потым пачаўся спад у ядзернай энергетыцы. Многія перадавыя краіны, такія як Германія, у першую чаргу, сталі закрываць ядзерныя праграмы і попыт на трэнажоры для АЭС упаў. На шчасце, на той жа фірме быў і іншы, не менш важны накірунак – чыгуначны транспарт. І Сяргея перакінулі ў гэту галіну.

Што гэта сабой уяўляе? Машыніст лакаматыва або метро таксама павінен адпрацоўваць так званыя нестандартныя сітуацыі ў штучна створаных умовах – на трэнажоры, які ўяўляе сабой кабінку – дакладную копію кабіны лакаматыва. Яна ставіцца на сістэму руху (6 ступеней свабоды) і рухаецца ў рытме цягніка. Складваецца поўнае ўражанне, што ты едзеш. Спецыяльная гукавая сістэма надае дзейству абсалютнае праўдападабенства.

Я пацікавілася, ці многа часу трэба на выраб такога трэнажора? Так! Вельмі шмат – прыкладна каля 1,5 года. Але калі заказчык вельмі спяшаецца, то можна і за год.

Попыт на трэнажоры вялікі. Многа робяць для ЗША. Найбольшая складанасць у кіраванні цяжкавагавымі і вельмі доўгімі чыгуначнымі саставамі. А ЗША як раз і славіцца тым, што ў іх асабліва доўгія цягнікі – даходзіць да 200-250 вагонаў у адным саставе. Пакуль апошні вагон кранецца, праходзіць каля хвіліны. Пры гэтым пачынае дзейнічаць цэлы сонм складаных дынамічных сіл.

Яшчэ адзін накірунак дзейнасці фірмы – трэнажоры для высокаскарасных цягнікоў. Сяргей асабіста ўдзельнічаў у праекце для англійскай фірмы “Верджын”. Прымаў удзел ён і ў праекце для метро Каіра (Егіпет). Зараз ствараецца вельмі вялікі праект для Індыі – гэтая краіна заказала адразу 12 трэнажораў для грузавога і пасажырскага транспарту. Якраз у сярэдзіне верасня, пасля адпачынку ў Беларусі Сяргей паехаў у Індыю – здаваць выраблены трэнажор.

З жонкай ён пазнаёміўся ў цягніку, калі ехаў на вучобу ў Францыю, а Ганна (так завуць жонку) ехала ў госці да сястры. Зараз у іх двое дзяцей – Маргарыта і Аляксандра. Дарэчы, першую дачку назвалі ў гонар гераіні рамана М. Булгакава “Майстар і Маргарыта”. І Сяргей і Ганна, абодва – прыхільнікі творчасці гэтага вялікага пісьменніка.

Жонка скончыла Маскоўскі педагагічны інстытут і некаторы час працавала ў Францыі. Зараз яна зноў збіраецца вучыцца, каб атрымаць якую-небудзь больш прыкладную спецыяльнасць, што дало б больш магчымасцей уладкавацца на працу.

Сяргей Рышардавіч Памецька, як і яго бацька, чалавек адкрыты, шчыры, добразычлівы. Захапляецца спортам, асабліва конным (верхавой яздой).

Беларусь вельмі палюбіў, як ён сам кажа, яшчэ з дзяцінства – з таго часу, калі бацька прывёз яго ўпершыню ў Глушыцу, у госці да бабулі. І зараз яму вельмі падабаецца хараство беларускай прыроды, дабрыня беларускага народа. Ініцыятарам паездкі на Радзіму бацькі быў якраз ён, Сяргей.





***У час адпачынку на радзіме бацькі***

## ***Шматгранны талент земляка***

Прынята лічыць,што жыццё – гэта збег абставін і выпадковасцей. Але як часта яно нам дапамагае, падказвае, расстаўляе знакі на сцяжынках-дарожках лёсу, толькі трэба сумець заўважыць і зразумець.Прыкладна так здарылася ў далёкім 1982 годзе, калі. Прыводзячы ў парадак новыя часопісы ў бібліятэцы мне,чамусьці, захацелася палістаць “мужчынскі” часопіс “Моделист-конструктор”. Як заўсёды, пачала з канца і адразу ж, на апошняй старонцы вокладкі, сярод іншых фотаздымкаў маю ўвагу прыцягнуў здымак, на якім малады мужчына настройваў клавішны музычны інструмент. Нешта няўлоўна знаёмае прамількнула ў засяроджаным твары гэтага чалавека. Чытаю тлумачэнне: «Рижанин Феликс Станевич демонстрирует электромузыкальный синтезатор «Феликс – 201». Ніякіх сумненняў больш не магло быць – гэта мой былы сусед, якога я смутна памятаю 11-гадовым хлапчуком, калі прыбягаў з суседняга хутара гуляць да нашых, Глушычных дзяцей. Заўсёды сур’ёзны, засяроджаны, поўны нейкіх ідэй, ужо тады было бачна, што ён праславіць сваё імя.



Даўно ўжо стала штампам пачынаць біяграфіі знакамітых беларусаў з выказвання: “Нарадзіўся ў беднай сялянскай сям’і”. Да біяграфіі майго героя гэтыя словы таксама маюць дачыненне. Толькі трэба агаварыцца, што сям’я была беднай матэрыяльна, затое багатай духоўна. У сям’і любілі і разумелі мастацтва і літаратуру, па вечарах часта гучалі шчырыя беларускія і польскія народныя песні і музыка. Брат маці Юзэф быў фанатычным скрыпачом, які загінуў на вайне у свае 20 год. Усё гэта пакінула глыбокі след у сэрцы хлапчука.

Ад бацькі, Антона Казіміравіча, ён пераняў тэхнічныя здольнасці. Яго бацька быў, можна так сказаць, майстрам-самавучкам. Не маючы магчымасці вучыцца, атрымаць хоць кроплю інфармацыі, ён чыста інтуітыўна рамантаваў

людзям радыёпрыёмнікі, ровары, гадзіннікі. “Бывала, што дом напаўняўся ціканнем дзесяткаў будзільнікаў і насенных гадзіннікаў” – успамінае Фелікс. Потым ён навучыў мясцовую дзетвару будаваць млынкі на ручайках вясной яны давалі першае уяўленне аб тэхніцы, яе магутнасці і з’явах. А пасля усе хлапчукі з захапленнем лазілі па дрэвах, імкнучыся як найвышэй устанавіць антэну для дэтэктарных прыёмнікаў на навушніках, якія, у асноўным, таксама былі самаробнымі.

Ад маці, Станіславы Францаўны, атрымаў у спадчыну прыгожы голас, музычныя здольнасці і бязмежную любоў да роднай зямлі.

Яшчэ Фелікс дзякуе Богу за тое, што у яго жыцці быў прыклад станоўчага лідэра – сусед Рышард Памецька (зараз ён вучоны-фізік у Обнінскім НДІ). На пяць гадоў старэйшы, ён выпісваў часопіс “Радыё” і прагрэсіраваў неверагодна хутка, ахвотна дзяліўся сваімі ведамі і заўсёды гатоў быў дапамагчы свайму малодшаму сябру.

Дзяцінства Фелікса аднак не было бясхмарным і бесклапотным. У пачатку чацвёртага класа ён захварэў запаленнем лёгкіх у цяжкай форме. Выратавалі яго тады толькі ін’екцыі стрэптаміцына. Але тады яшчэ ніхто не ведаў аб пабочных дзеяннях гэтага лякарства. Да наступнай зімы развілася цяжкая форма бранхіяльнай астмы. Усю зіму давялося правесці ў ложку. Бацькі вазілі па ўсіх магчымых клініках і дактарах: Вільня, Гродна, але...выратавання не было. Астма была алергічнай, а першыя працы па алергіі з’явіліся ў ЗША толькі ў 1961 годзе. Сітуацыя стала крытычнай, калі бацькам давялося прадаць адзіную карову. Нехта падказаў, што ў іх сітуацыі карысна памяняць клімат. Рашэнне было прынята, хоць і было нялёгкім. Трывог (як там, у чужой старане) і слёз было больш чым дастаткова. Але з пераездам у Латвію ад хваробы пазбавіўся хутка і надоўга. І зараз Латвію лічыць сваёй другой Радзімай, таму што, менавіта сюды прывёз яго бацька за выратаваннем.

Намнога цяжэй было з сацыяльнай адаптацыяй. Класічны лёс дзяцей – эмігрантаў: “Мы былі, як шчаняты, выкінутыя у ваду, “барахтацца” трэба было з усёй сілы, каб выжыць. Вось і атрымліваліся з нас калі інжынер, то лепшы, калі музыкант, то віртуоз, калі бандыт, то самы круты”- пісаў у адным з лістоў Фелікс.

Голад і нястача яшчэ доўга праследавалі сям’ю ў Латвіі. Рабская праца ў калгасах, пераезды з месца на месца, насмешкі і здзекі ў школе не зрабілі жорсткай юную душу, але прывялі да таго, што яшчэ ў пятым класе цвёрда вырашыў любой цаной вырвацца з гэтай калгасна-люмпенскай сістэмы, хоць дакладна яшчэ не ведаў як. Шляхоў было некалькі. У школе былі тры сябры: Юра, Пеця і Грыша, такія ж эмігранты, як і Фелікс. Юра, праўда, быў латыш, але нарадзіўся ў Сібіры, у ссылцы. Ён і навучыў Фелікса латышскай мове. Пеця быў сынам партызана. Потым іх шляхі разышліся. Юра вырашыў, што толькі сілай можна ўсталяваць справядлівасць у свеце і стаў бандытам. След яго загубіўся па турмах. Пеця ператварыўся ў звычайнага алкаголіка. Грыша стаў прафесійным баксёрам . Фелікс жа, як і марыў, паступіў на факультэт радыётэхнікі і сувязі Рыжскага палітэхнічнага інстытута. Адразу па яго

заканчэнню работу мяняў даволі часта. Потым быў перыяд захаплення музыкай і ён пачаў працаваць у ансамблі "Орнамент".

"Жалезная заслона" ў свой час вельмі стымулявала вынаходцаў. Многае трэба было зрабіць самім. Музыкантам даводзілася самім рабіць і перарабляць электрагітары, узмацняльнікі і іншыя музычныя інструменты. Каб ансамбль гучаў лепш за іншых, патрэбна была лепшая апаратура. Спаборнічалі не толькі музыканты, але і канструктары-гукарэжысёры. У сярэдзіне 70-х гадоў XX ст. Усё часцей на замежных запісах пачаў гучаць сінтэзатар гука ( вынаходніцтва амерыканца Роберта Муга). Гучанне здавалася ашаламляльным! Дзякуючы складанай сістэме узаемазвязаных генератараў гэтыя ЭМІ здольны ствараць багатую палітру гукаў. Магчымасці сінтэзу неабмежаваныя і Фелікс загарэўся ідэяй зрабіць сінтэзатар. Стаў збіраць па крупінках інфармацыю, шмат эксперыментаваў. Але, як толькі з'явіліся першыя вынікі, аказалася, што ў Каўнасе Арунас Урбанас ужо зрабіў некалькі даволі прыстойных экземпляраў. Гэта прымусіла Фелікса працаваць яшчэ больш актыўна. Пасля рэспубліканскай выставы ў кастрычніку 1981 г. (аб чым пісала рэспубліканская газета "Советская молодёжь" 10.10.1981г.) ён паехаў са сваёй канструкцыяй на ВДНГ СССР увосень 1981 года. Прыехаў і каўнасец Арунас. Канструкцыя Фелікса была прызнана лепшай і ён атрымаў Залаты медаль ВДНГ СССР.

Папулярнасць "Орнамента" была ашаламляльнай, проста неверагоднай. Давалі па тры канцэрты ў дзень па выхадных і часта па працоўных днях. Першы канцэрт у г. Огрэ з удзелам Раймонда Паўлса сабраў 30 000 гледачоў. Сярод ганаровых гасцей былі Ала Пугачова і Ільля Рэзнік.

Было шмат паездак па Саюзе і за мяжу. Першая паездка ў ГДР на фестываль FDI у Расток, потым у Францыю, на фестываль газеты "Юманітэ"; Японія – горад-пабрацім Рыгі Кобэ, на фестываль перад адкрыццём Універсіяды (1984); 1985 – Канада, на выставу ЭКСПО горада Манрэаль і Ванкувер. "Там латышская эміграцыя спаткала нас настолькі гасцінна, што мы захмялелі ад захаплення, - успамінае Фелікс, - Двое сутак вазіў па Манрэалю Імант Фрэйберг, муж сённяшняй прэзідэнта Латвіі Вайры Фрэйберге. З гастролямі па Канадзе і Амерыцы былі яшчэ два разы ў 1987 і 1989 гадах.

Былі паездкі ў В'етнам, у горад-пабрацім Дананг і па іншых гарадах. Пасля першых гастроляў успаміны былі самыя светлыя. "Народ вельмі бедны і жыве ў неверагодна цяжкіх умовах, але вельмі працавіты, аптамістычны і дабразычлівы". Магчыма, светлыя ўспаміны аб В'етнаме ў Фелікса звязаны яшчэ з тым, што там ён быў узнагароджаны В'етнамскім ордэнам "Дружбы народаў"

Запомнілася паездка ў Алжыр, дзе былі арганізаваныя Дні культуры Латвіі. Праз два дні яны былі сарваны – у горадзе пачаліся вялікія беспарадкі, амаль паўстанне. За тыдзень загінула каля 200 чалавек. "Орнамент" быў выселены за горад, дзе пад аховай пражылі тыдзень, а пасля спецыяльным самалётам з Масквы былі дастаўлены дадому.

Па праграме культурнага абмену былі ў Швецыі і Англіі. Выступленні былі арганізаваны ў школах, пансіянатах, бальніцах.

Каля сарака дзён доўжыліся гастролі па Ўзбекістане, у асноўным па Галоднаму стэпу: “Нас там прымалі, як князёў, але народ там жыў проста жудасна! Сапраўднае пекла. Нястача і няўсцешнасць у адрозненне ад аптымізму в’етнамцаў”.

Былі ў Горным Алтаі.

У Маскве выступалі ў знакамітай канцэртнай зале “Россия».

Музыка “Орнамента” не была чыстым фальклорам. Гэта была музыка сельскіх вечарынак, хаця, па неабходнасці гралі і аўтэнтычную фальклорную музыку і ў гэтых адносінах гэта музыка была больш народнай, чым арыгінальны фальклор. Адгэтуль, напэўна, і папулярнасць.

Фелікс у ансамблі спяваў, граў на гітары, часам пісаў тэксты і музыку. А калі стаў адчувальным недахоп музычнай адукацыі, застаўся працаваць у якасці гукарэжысёра.

Праца ў “Орнаменце” дала магчымасць назапасіць той багаты вопыт, які зараз з поспехам выкарыстоўвае для тэхнічных рашэнняў у сваіх сённяшніх канструкцыях і паспяхова канкурыруе з лепшымі інжынерамі нават у Амерыцы.

Зараз працуе ў Рызе, у кампаніі Baltic Latvian Universal Elektronics (BLUE) у якасці галоўнага інжынера. Кампанія выпускае студыйныя мікрафоны і знаходзіцца ў Лос-Анжэлесе. Яшчэ працуе ў фірме Audio AE, якая прадае і ўстанаўлівае ўсялякую апаратуру, звязаную з гукам, акустыкай і музыкай.

У Фелікса Станевіча таленавітая творчая сям’я. Старэйшая дачка Эва закончыла аспірантуру ў адным з лепшых ВНУ па дызайну ў Мілане (на італьянскай мове). Зараз яна з’яўляецца адным з лепшых дызайнераў інтэр’ера ў Латвіі. Малодшая, Крысціна, скрыпачка. Яшчэ ў трохгадовым узросце катэгарычна запатрабавала, каб ёй купілі скрыпку.

“Нам пашанцавала, што мы нарадзіліся паслы вайны і на працягу жыцця не давялося перажываць вялікіх войнаў, але, тым не менш, лёс кідаў нас і ў агонь, і ў ваду” – успамінае Фелікс. Багацце перажытага спрыяла таму, што творчае аблічча яго аказалася шматгранным.

Кранае яго беззапаветная любоў да роднай зямлі. Аб’ездзіўшы амаль увесь свет, ён ніяк не можа забыць Глушыцу, дзе нарадзіўся і правёў дзіцячыя гады. “Настальгія па Радзіме ўсе гэтыя гады была вялізнай. 90% усіх маіх сноў былі ў Глушыцы, каля рэчкі, каля Каймінскіх азёр”.

Памятае, любіць і ўдзячны кожнаму куточку роднай зямлі. Успамінае салодкі кляновы сок ранняй вясной, яшчэ ў замаразкі. Калі праз многа год наведваў Глушыцу, гэты клён яшчэ стаяў і ён быў яму як бы брат, таму што некалі яны раслі разам і сілкаваліся адным сокам.

А самыя светлыя ўпаміны – гэта аб тым, як рана-рана, летам, на ўзыходзе сонца, беглі яны, пацаны, з вудамі ў руках па расе і лясному пяску на

азёры, на рэчку. Здавалася, што светлыя анёлы порхалі  тады над іх галовамі, падтрымлівалі і ахоўвалі іх, і беглі яны, не датыкаючыся зямлі...

***Маці і дзед Казімер***



***У Розкальнах. Латвія. 1963 год***












***Пад час гастроляў у Японію***

***Ля свайго сінтэзатара***




“Нора Джонс – известная американская джазовая певица, получившая множество самых престижных наград «Гремми». В студии SEAR SOUND в Нью-Йорке, где она записывается, используются микрофоны, сконструированные Феликсом. И в этом году он работает над специальным заказом для этой студии.

***З братам Маркам на рыбалцы***





***Возера яго дзяцінства (Кайміна).***
***Пад час наведвання радзімы. Верасень 2004 года.***

*На дзедавай магілцы*



**…Тут адзінокі крыж стаіць**
**Стары–старэнькі замрушэлы**
**Тут прыняла зямля спачыць**
**Станевіча – дзядулю – Казімера.**
**Даруй нам, родны наш, прабач**
**Мы пра цябе не забывалі**
**Зусім не наша ў тым віна**
**Што ў свет з гнязда павыляталі**



***Перад ад'ездам. Верасень 2004 год***

# ***Смуткуе сэрца па радзіме***



З Генуэфай Антонаўнай Семашкевіч (у дзявоцтве Станевіч) я пазнаёмілася выпадкова, калі шукала адрас яе брата для раённай кнігі «Памяць». Патэлефанавала сяброўка і прапанавала паслухаць верш. Пакуль яна чытала перад маімі вачыма праплывалі карцінкі з уласнага дзяцінства, а ў горле стаяў горкі камяк – настолькі кранаюча і вобразна ён быў напісаны. Яшчэ больш была здзіўлена, калі даведалася, што аўтар з гэтых радкоў простая жанчына са звычайным лёсам, якая нарадзілася ў 1942 годзе на суседнім хутары Глушыца.

«Жыццё склалася так, што гадавалі мяне дзядуля з бабкай у Кісялях (аб гэтым упамінае ў вершы «Сяброўцы дзяцінства Юзэфе»). Да сям'і прыбягала кожную вольную хвілінку і сваіх маму і тату я любіла без памяці, як і сваіх малодшых брацікаў (верш «Вясновы настрой») – успамінае Генуефа Антонаўна.

Усе ў сям'і Станевічаў людзі таленавітыя, творчыя. Маці, Станіслава Францаўна, мела прыгожы голас ад прыроды, бацька, Антон Казіміравіч-тэхнічныя здольнасці; дзядзька Юзэф быў скрыпачом і пісаў вершы; цёця Лёня складала вершы і тэксты рэлігійных песень, якія сама ўкладала на музыку; брат Фелікс дасягнуў пэўных вышынь у радыётэхніцы і музыцы, доўгі час працаваў у латышскім фальклорным ансамблі «Орнамент». Сама Генуэфа Антонаўна акрамя паэтычных мае і музычныя здольнасці, спявае ў парафіяльным хоры касцёла ў горадзе Лентварыс.

Рана выйшла замуж і пераехала ў Літву (як і многія з яе пакалення). «Працавала, як усе, атрымлівала граматы, значкі ўдарніка сацыялістычнага спаборніцтва і інш. Вершы пісаць і не думала- расказвала Г.А.Семашкевіч – ды трэба ж было захварэць. Агарнула бяссонніца, вось і думаеш аб усім. А зімовыя ночы бясконца доўгія… Найбольш пладатворны час, калі ўсе ціха, ноч і толькі ходзікі цікаюць, і месяц свеціць, тады хочацца маліцца, успамінаць і прыходзяць словы, якія трэба запісаць, інакш усё пройдзе, як з'ява».

Многія вершы напісаныя тады, калі Генуэфа Антонаўна наведвала родныя мясціны («Брату Феліксу»). Яна любіць людзей, прыроду, яе хараство, яна чалавек шчыра адданы свайму прызванню і памяці чалавечых сэрцау.

У вершы «Глушыца» яна з цяжкім болеем у сэрцы піша пра сваю радзінную вёсачку, аб колішнім існаванні якой напамінаюць толькі падмуркавыя камяні, яблынькі ў садзе, ды кусты бэзу і шыпшыны, якія некалі буялі пад вокнамі роднага дома.

Вершы Г.А.Семашкевіч сапраўды народныя. Напісаны пра тое, што хвалюе, што блізка і зразумела нашым людзям. Яны падкупаюць сваёй вобразнасцю, прастатой і глыбінёй, сваёй замілаванасцю да родных мясцін, да беларускай зямлі.

Прыемна здзіўляе той факт, што большую частку жыцця пражыўшы ў Літве, Генуефа Антонаўна не забыла матчыну мову, памятае род, кроўную повязь з роднай зямлёй.

Як сказаў Францыск Скарына: «Людзі павінны, дзе нарадзіліся і ўзгадаваліся да гэтага месца вялікую любасць мець». Як бачым, гэтая любоў не гасне ў сэрцы Генуефы Антонаўны Семашкевіч.

У 2005 годзе, у выдавецтве "Сумежжа" (Паставы) выйшаў невялікі зборнік вершаў Г.Семашкевіч "Добры дзень, мая Глушыца", які адразу ж знайшоў свайго чытача.

## ВЯСНОВЫ НАСТРОЙ

Сукню новую адзеўшы,
Бульбяных бліноў паеўшы,
Ад бабулі з Кісялёў
Я іду к сабе дамоў.

І сцяжынкаю праз вёску
Я спяшаюся на проста
Па кладачцы праз ручэй,
Іду хуценька праз Глей.

З крутой горачкі бягу
Праз Трашчанскую мяжу,
Праз алешнік і крыніцу
Да матулі ў Глушыцу.

Праз Трашчані, ды праз вёску
Мне ў Глушыцу далей трошкі.
Я ж сваю сцяжынку маю
Вёску спрытна абмінаю.

Цераз поле, сенажаць
І з пагурка ужо відаць
Хаты родныя акенцы.
Я ж у новенькай сукенцы!

Паркалёвай, у гарошак
І пашытай сонца-клёшам,
Круглы модны каўнярок
Па таліі паясок.

Зачасаны валасы
У тугія дзве касы,
Перавіты адмыслова
Белай стужкаю шаўковай.

Ногі босыя мае
Па калена ў расе,
Чыста вымыты расою,
Брыліянтавай, веснавою.

А на вокал, мілы Божа!
Гэтак хораша, прыгожа,
Жоўтых кветак міліёны
Расцвілі ў траве зялёнай
Па узгорках і па склонах
Жоўтых, белых і чырвоных!
Залатыя дываны
Вясна сцеліць па зямлі.
Па балоце, па вадзе
Бусел на адной назе
Застыў справаю заняты-
Жабкау ловіць буслянятам.
А пад небам ясным, чыстым
Сваім голасам срабрыстым
Жаўрук спеў вядзе бясконцы
І ўзлятае аж да сонца.
У Красным лузе дзесь зязюля
І варожыць, і кукуе,
Сонца у небе прыгравае
І душа мая спявае.
Харастваа такога цуд:
У вёсцы яблыні цвітуць,
Як прыгожыя паненкі
У шлюбных беленькіх сукенках.
Сцежка вузкая ў траве
Да дому мяне заве.
Там чакаюць тата з мамай,
Брацікі мае таксама.
Вось масток праз ручаёк,
Мыю ногі ў крыніцы-
***«Добры дзень, мая Глушыца!»***

## ЧАМУ?

Скажы мне, сяброўка мая дарагая
Чаму ў жыцці перастройка такая?
Як пешшу хадзіць-доугай стала дарога,
Чаму непаслушнымі робяцца ногі?
Чаму толькі у сне я касу заплятаю?
Наяву сівыя пад хустку хаваю.
Чаму у вачах слёзы частыя госці?
Чаму са здароў'ем не ладзіцца штосьці?
Чаму ў бясконцыя доўгія ночы
Так сэрца трывожна баліць ад журботаў?

Чаму гэтак хутка  жыццё праляцела?
Сяброў дарагіх усё меней і меней.
Чаму гэтак хочацца хоць на гадзіну
У свой родны куток заглянуць на радзіму.
Зайсці па дарозе да родных у госці
Крыжам пакланіцца на ціхім пагосце.
Зайсці у касцёл і за усіх памаліцца
За усіх: за жывых і за тых, што у зямліцы.
Скажы мне сяброўка, скажы мне, чаму
Так просіць душа ў сваю старану.

*2003 год*

## БРАТУ ФЕЛІКСУ З УДЗЯЧНАСЦЮ

Народ наш любіць вандраваць,
Зімой на пляжы загараць,
На цёплым моры за мяжой
Дзе сонца і марскі прыбой.
А летам з гор, дзе снег іскрыцца
На лыжах з ветрам пракаціцца.
Глушыца ж наша, брат, з табой,
Зараз таксама за мяжой.
На свеце цудаў не злічыць,
Пабачыць кожнаму прыемна,
Ды птушка з выраю ляціць
На роднае зямлі камене.
А дзе вандроўка, там прыгода
Ды закапрысіла пагода
Як нам з табою выязджаць,
Божага свету не відаць!
Як з цэбра, з неба дождж ідзе
Такая восенню пагода.
Ты кажаш: «Ну і няхай ліе,
А мы з табою ў дарогу».
У машыне суха, цёпла-рай,
Няспешная ў нас размова.
І  я з табой на света край
Адправіцца гатова.
Дарогі роўны, мокры шлях
Віецца перад намі
Шлагбаум падняты - у добры час,
Апошняя мяжа за намі.
Палі і вёскі, і мястэчкі
Мільгаюць хутка за акном.
У Віліі – шырокай рэчкі
Блакітны пояс пад мастом.

За паваротам паварот,
За Спондамі ужо Жалядзі
Як белы Анёл, адноўлены касцёл,
І могілак рады ў даглядзе.
Тут адзінокі крыж стаіць
Стары – старэнькі, замрушэлы,
Тут прыняла зямля спачыць
Станевіча – дзядулю – Казімера.
Даруй нам, родны наш, прабач,
Мы пра цябе не забывалі,
Зусім не наша ў тым віна,
Што ў свет з гнязда павылятали.
А дождж стараецца усё больш,
І сыплюцца лісты з бярозы,
А можа гэта і не дождж,
А нашы, брат, з табою слёзы.
Мы шчыра молімся з табой,
І свечка ціха дагарае,
Імгненне гэтае святла
Навек мы у сэрцы захаваем.

***З вандроўкі на Радзіму. Верасень 2004 год***



Дзядуля з бабуляй, якія выхоўвалі ў дзяцінстве Генуэфу Антонаўну.
На здымку: Лось Франц Іосіфавіч, Антаніна Іванаўна і цёця – Леакадзія Францаўна

***"Дедушку я помню, хотя и смутно, как человека физически очень сильного. В молодости (ещё до революции) он, чтобы купить землю, ездил на заработки в Петербург, где работал бурлаком – таскал по Неве баржи с***

***гравием, песком и др. стройматериалами для строительства города. За это платили золотыми рублями. Потом на своей земле трудился не жалея сил. Потом вайна, потом колхоз…»***

***(З ліста Ф.Станевіча)***

Гэтыя незвычайныя і крыху сумныя гісторыі распавёў мне Ф.Станевіч. Усе у іх сям'і былі людзьмі добрасардэчнымі і добразычлівымі, можа таму і здараліся з імі усе гэтыя прыгоды.

## *ГІСТОРЫЯ БЕЛАГА КАТА*

Аднаго разу, калі Феліксу было ўсяго тры гады, а яго брату Марку – пяць, маці прынесла дадому маленькі пушысты цуд – ласкавае белае кацяня. З вялікай цяжкасцю выпрасіла яго ў далёкай сваячкі, старой пані, якая вельмі любіла катоў. Ніяк не хацела аддаваць яна гэтага каточка, тым больш у сям'ю, дзе падрасталі два хлапчукі.

—Твае хуліганы зацягаюць і замучаюць такое пяшчотнае стварэнне, — гаварыла яна.

Феліксавай маці прыйшлося ледзь не прысягнуць, запэўніць, што яна будзе строга сачыць за дзецьмі і не дазволіць пакрыўдзіць коціка.

Хлопчыкі Марк і Фелікс палюбілі яго больш за ўсё на свеце і, канешне ж, не крыўдзілі.

Белае, як вядома, хутка забруджваецца, і калі маленькія гаспадары заўважылі, што іх коціка пара купаць, узялі вялікі чыгун з вадой і спрабавалі акунаць туды кацяня, якому чамусьці гэта працэдура зусім не спадабалася і ён адчайна супраціўляўся, вырываўся, ды гвалт падняў такі, што хоць вушы затыкай.

І трэба ж было якраз на той момант прыйсці сваячцы адведаць ката. Калі ўбачыла, які здзек чыняць "хуліганы" над яе любімчыкам, то падняла лямант яшчэ мацнейшы, чым кот. Хацела адабраць, ды дзеці паспелі схавацца разам з катом. Але дыпламатычныя адносіны гэта асоба з іх сям'ёй перапыніла надоўга.

Тым часам кот вырас у вялікага дужага прыгажуна і стаў сапраўдным гаспадаром. Дзеці яго нават баяліся. Быў вельмі разумны і досыць хітры. Свае кашачыя абавязкі выконваў спраўна – большасць мышэй пералавіў, а астатнія збеглі падалей ад такога «тэрарыста». Кратам з іх агарода таксама прыйшлося шукаць больш зацішнае месца.

А яшчэ ў ката быў любімы занятак: назіраць, як гаспадар рэжа на дошчачцы сала альбо мяса. Тады кот садзіўся побач з абыякавым выглядам – як бы яму зусім нецікава, што там на стале дзеецца – глядзеў некуды ў акно. Але варта было толькі чалавеку адвярнуцца на хвіліну, як кот маланкава хапаў лапкай кавалак мяса, клаў у рот і працягваў сядзець нерухома, як ні ў чым не бывала.

І так працягвалася даволі доўга, пакуль гаспадар не вырашыў зладзюжку правучыць. Гэтак жа сама, на дошчачцы, пачаў рэзаць вельмі моцны тытунь-самасад. Кот тут як тут: прымасціўся побач і, калі гаспадар знарок адвярнуўся, схапіў лапкай тытуню і адправіў у рот. Што з ім рабілася! Мяўкаў дзікім голасам, кашляў, чхаў, насіўся з ашалелымі вачыма па падлозе, па лавах, па ложках, ледзь не па сценах і столі! Такі ўрок пайшоў на карысць – больш ужо ніколі нават не садзіўся побач са столікам, дзе рэзалі мяса.

Другі раз вярнуўся кот дадому прагаладаўшыся (відаць, паляванне было няўдалым), паглядзеў, што ў доме адна малеча, а яны яму не ўказ, падышоў да кухоннай шафкі, сам высунуў шуфлядку, дастаў вэнджаную рыбіну і пачаў есці. Калі хлопчыкі паспрабавалі адабраць, ён так пагрозліва завурчэў і паказаў вострыя кіпці, што яны не на жарт спужаліся і мусілі рэціравацца на печ.

Але, нягледзячы на ўсё гэта, ён быў усеагульным любімцам і гаспадаром не толькі ў доме, але і ва ўсёй Глушыцы. Калі сям'я выязджала ў Латвію, узялі яго з сабой, але коцік пакідаць свае родныя мясціны не згадзіўся і на першым жа кіламетры саскочыў з машыны.

### *...БЕЛАГА САБАЧКІ*

У бабулі быў сабачка. Беспародны белы дварнячок. Бабка яго не любіла і нават імя яму ніякага не дала. Бедны сабачка адчуваў гэтую крыўдную, незаслужаную няпрыязь гаспадыні і чакаў спрыяльнага выпадку, каб даказаць ёй, што ён верны сябар і надзейны абаронца. І такая нагода здарылася.

Аднойчы гаспадыня працавала ў полі і ўбачыла, як напрасткі бяжыць да яе белы сабачка. Падбег, не спыняючыся, гаўкнуў патрабавальна некалькі разоў і зноў павярнуў у бок вёскі. Адбег трошкі, азірнуўся, пабачыў, што гаспадыня не звяртае ўвагі, працягвае працаваць, зноў падбег, нецярпліва паклікаў – і так некалькі разоў. Калі зразумеў, што гэтая тактыка не "даходзіць" да гаспадыні, падбег, ухапіў яе зубамі за падол і стаў цягнуць у бок дома. Не хацелася бабулі кідаць працу, але ж сабачка так настойліва зваў дадому, што рашыла схадзіць паглядзець. Так і пайшлі яны ўдваіх: сабачка шпарка бег уперадзе, раз-пораз азіраючыся, ці ідзе за ім гаспадыня, а жанчына ззаду. Як толькі ўвайшлі на падворак, жанчына ўбачыла, што яе кароўка зачапілася ланцугом за яблыню і так уматалася, што ўжо ледзь дыхала, хрыпела.

Бабуля карову паспела ўратаваць, дзякуючы кемлівасці свайго вернага сябра – сабачкі. З той пары ён хадзіў у фаварытах – і смачнейшы кавалачак, і белы блінок – усё яму, у першую чаргу.

### *...І БЕЛЫХ БУСЛОЎ*

Вясну ў той год рана прынёс на сваіх дужых крылах ласкавы, малады паўднёвы вецер. Недзе ўжо ў сярэдзіне сакавіка жаваранкі разбудзілі наваколле сваімі звонкімі пералівамі, гракі пачалі рамантаваць гнёзды. За імі, падкупленыя яркім сонейкам, прыляцелі і буслы. Ды зіма не хацела так

проста здаваць свае пазіцыі. Затоіцца дзесьці ў лясной глухамані, збярэ рэшткі сіл у кулак, пакліча на дапамогу паўночны вецер і напусціць мяцеліцу з марозам, як бы помсцячы людзям за тое, што занадта радуюцца прыходу вясны.

Так было і на гэты раз. Устала бабуля раніцай, выглянула ў акно, а там усё белае-белае – зіма зноў вярнулася. Выйшла ў сені, адчыніла дзверы і вачам не паверыла – проста перад дзвярамі стаяць два буслы — прыйшлі шукаць паратунку. Жанчына адчыніла дзверы шырэй і кажа: “Ну, заходзьце, мае птушачкі, грэйцеся!” Другі раз паўтараць не спатрэбілася — буслы хуценька пераступілі парог і зайшлі ў сені. Відаць, добра змерзлі бедалагі, да таго ж, відавочна, разумелі, што гэтая жанчына ім дрэннага нічога не зробіць. Так яны пражылі “на кватэры” некалькі сутак, пакуль не сышоў снег, а там паляцелі да сваіх гнёздаў і заняліся сваімі шматлікімі вясеннімі клопатамі.

## *ПРЫГОДЫ КАЗЛЯНІЦІ АНСА*

Гэтая прыгода здарылася, калі сям’я Станевічаў жыла ў Латвіі. Летам іх сусед-латыш касіў луг і параніў дзікае казляня, якое нерухома ляжала ў высокай траве. Кажуць, у касуль так бывае: маці-касуля пакідае ў траве сваё дзіцятка, а сама ідзе шукаць смачны корм. Казляня ляжыць да прыходу маці.

Сусед прынёс параненую жывёлу ў дом Станевічаў, бо ведаў, што яны людзі міласэрныя і спагадлівыя. Ранка аказалася не страшнай, яе апрацавалі, хворага пакармілі і адпусцілі на волю. Але ён з падворка нікуды не пайшоў – яму было весела сярод курэй, дамашняй жывёлы. Дзеці моцна палюбілі гэтую райскую істоту. Назвалі казляня Ансам (па латышску – “анс” – козлік).

Так козлік пражыў у іх год, а як наступіла вясна, “голас крыві” ўсё-такі паклікаў у лес. Дзеці, якія прывыклі да Анса і любілі з ім гуляць, вельмі перажывалі, ці вернецца ён назад, хаця і трымаць пад прымусам таксама не хацелі.

Прынята лічыць, што дзікая жывёла, выгадаваная ў хатніх умовах, гіне ў дзікай прыродзе ад сваёй непрыстасаванасці. І да людзей яна становіцца занадта даверлівай, ні ў кім не бачыць ворага.

У той жа дзень, пад вечар, Анс вярнуўся. Праз пару дзён зноў пацягнула яго ў лес. І на гэты раз ён прабыў там тыдзень. Потым пайшоў і не з’яўляўся цэлы месяц. Усе ўжо былі ўпэўнены, што больш не вернецца. Але ён прыйшоў. Прычым не адзін. Побач з ім плячо ў плячо ішла грацыёзная пужлівая касуля. Анс абвёў яе вакол будынкаў, прывёў у падворак. І гэта выглядала так, нібыта ён прыйшоў прадставіць нявесту сваім выратавальнікам, спытаць у іх дазволу, блаславення на самастойнае асабістае жыццё. А можа і паказаць сваёй сяброўцы дом і сардэчных людзей, у якіх у ліхую гадзіну, у час небяспекі і яна можа знайсці выратаванне.

Пастаяў колькі хвілін у задуменні, пэўна, успамінаючы вясёлыя, бесклапотныя дні, праведзеныя тут з дзетварой. Гаспадыня прапанавала яму паесці, але Анс адмовіўся, і яны няспешна пайшлі ўдваіх у бок лесу, каб больш ужо не вярнуцца.

## ДАДАТАК



Глушыца II



Кляменцій Валуевіч з жонкай, дачкой і сынамі



Госці з Латвіі ў Глушыцы. 1986г.

***<u>Не забываюць Глушыцу яе сыны</u>***



***Госці з Вільнюса і Мінска***





***Госці з Калінінграда і Савецка***





Глушыцу наведваюць турысты. Турыстычная група пад кіраўніцтвам І.Драўніцкага. Чэрвень, 2005г.



***…А фота так захапляюча прыгожае, такі кранаючы пейзаж! І сядочкі на снезе… Здаецца, гэта я прыйшла ў Глушыцу, а там нічога і нікога. І не ведаю, што рабіць… Толькі звонкая цішыня, толькі яснае неба…***

*(з ліста Г.Семашкевіч)*



***Апошнія з Глушыцы***